САМАЯ ПОЎНАЯ ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ: 31 КАНАЛ




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ЛЮТАГА 2012 г.
ПЯТНІЦА
№ 22
(27137)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АНАМАЛЬНА ХАЛОДНЫ ЛЮТЫ

**СЯРЭДНІ ТЭМПЕРАТУРНЫ ФОН ЦЯПЕР У БЕЛАРУСІ НА 12—16 ГРАДУСАЎ НІЖЭЙШЫ ЗА КЛІМАТЫЧНУЮ НОРМУ**

**Вельмі халоднае надвор'е захаваецца ў нашай краіне яшчэ і на працягу першай паловы лютага, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У пятніцу чакаецца пераменная воблачнасць, і толькі ў асобных раёнах магчымы невялікі снег. Тэмпература ўдзень мінус 15—21, у асобных раёнах нават да 23 марозу.

А вось у выхадныя да нас пачнуць рухацца больш вільготныя паветраныя масы з боку Чорнага мора. Павялічыцца воблачнасць. У суботу па паўднёвым усходзе, а ў нядзелю ўжо амаль паўсюдна пройдзе снег, месцамі мяцеліца. Тэмпература паветра ўначы на суботу 22—29 градусаў ніжэй за нуль, на паўночным захадзе пры праясненнях да мінус 30—32; удзень у суботу мінус 15—20. Крыху цяплей будзе ў суботу на паўднёвым усходзе, дзе ўначы мінус 16—21, удзень —10—14 марозу. У нядзелю ўначы прагназуецца мінус 15—22, на паўночным захадзе мінус 23—28, удзень — 11—18 марозу. У Гомельскай вобласці і на паўднёвым усходзе Магілёўскай уначы мінус 9—14, удзень — 5—10 градусаў ніжэй за нуль. Маразы ў гэтыя выхадныя стануць для нас сапраўды жорсткімі, бо будуць суправаджацца часам рэзкім парывістым ветрам.

У першыя дні наступнага тыдня маразы крыху адпусцяць. У панядзелак уначы паўсюдна, а ўдзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература ўначы мінус 9—14, на ўсходзе — да 15—20 марозу; удзень 5—12 ніжэй за нуль, на ўсходзе — да мінус 15 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у сярэдзіне наступнага тыдня атмасферны ціск пачне павялічвацца і зноў вернуцца моцныя маразы. Так, уначы ў сераду прагназуецца мінус 15—22, пры праясненнях да 25—28 марозу, удзень — 10—17 градусаў ніжэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СУПРАЦЬ МАРОЗУ — УСМЕШКА


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЭНЕРГАТАРЫФЫ ДЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў 2012 ГОДЗЕ ПАВЫШАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

**Энергатарыфы для прамысловасці Беларусі ў 2012 годзе павышацца не будуць. Аб гэтым заявіў учора першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка на калегіі Міністэрства прамысловасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Перспектыва ў нас такая: павышаць не будзем, можа, яшчэ і знізім пасля ацяпляльнага сезона тарыфы на энерганосьбіты», — сказаў Уладзімір Сямашка. Ён падкрэсліў, што ў гэтым годзе кошт расійскага газу для Беларусі ў два разы ніжэйшы, чым у мінулым. Цана газу складае $165,6 за 1 тыс.куб.м. «У мінулым годзе мы мелі $340 за 1 тыс.куб.м», — нагадаў першы віцэ-прэм'ер.

Уладзімір Сямашка падкрэсліў неабходнасць далейшага зніжэння энергазатрат у прамысловасці і павышэнне энергаэфектыўнасці. Ён нагадаў, як складаецца такі інтэграваны паказчык, як энергазберажэнне. Сёння ў Беларусі на вытворчасць $1 тыс. ВУП затрачваецца 285 кг нафтавага эквіваленту. 20 гадоў таму гэты паказчык у Беларусі дасягаў 730 кг. У Расіі цяпер гэты паказчык складае 440 кг, ва Украіне — 430 кг.

Такім чынам, у Беларусі створана сістэма энергазберажэння, яна дзейнічае, але на яе павінны працаваць усе, у тым ліку прамысловасць. У прамысловасці ёсць шмат рэзерваў для зніжэння энергазатрат. Іх можна знайсці ў вытворчасці ліцця, гальванічных працэсах, іншых тэхналагічных перадзелах. «У гэтым сэнсе вялікай падмогай для прадпрыемстваў стане аб'яднанне іх у холдынгі, дзе міжкааперацыйныя затраты будуць зніжацца», — сказаў Уладзімір Сямашка.

## У БЕЛАРУСІ НЕАБХОДНА АКТЫВІЗАВАЦЬ ПРЫВАТЫЗАЦЫЮ ДЗЯРЖПРАДПРЫЕМСТВАЎ

**Аб гэтым заявіў учора на пасяджэнні калегіі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Румас, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«У Беларусі неабходна актывізаваць працэсы рэфармавання структуры дзяржаўнай уласнасці. Чым раней мы гэта пачнём рабіць, тым больш у нас шанцаў развівацца хутчэй, па сучасных сусветных тэхналогіях. І прыватызацыя — гэта вельмі важная крыніца такога развіцця», — адзначыў Сяргей Румас.

У 2011 годзе прададзены дзяржаўныя пакеты акцый 34 акцыянерных таварыстваў, што амаль у 7 разоў больш, чым у 2010 годзе. Аднак гэта складае толькі 19 працэнтаў ад агульнай колькасці таварыстваў, запланаваных да прыватызацыі ў 2011 годзе. «Такім чынам, па сутнасці, вынікі рэалізацыі плана прыватызацыі зусім не суцяшальныя і, калі прама сказаць, правальныя», — канстатаваў віцэ-прэм'ер.

Адна з прычын такіх вынікаў — непаваротлівасць асобных міністэрстваў і канцэрнаў. «Разам з тым не відаць роля Дзяржкаммаёмасці як каардынатара работы ў працэсе рэфармавання адносін уласнасці, не прапануюцца новыя прагрэсіўныя ідэі, што канкрэтна трэба зрабіць. Такія прагрэсіўныя меры і павінны быць выпрацаваны па выніках сённяшняй калегіі», — лічыць Сяргей Румас.

Дзяржкаммаёмасць паставіла перад сабой даволі амбіцыйную задачу па продажы ў 2012 годзе 133 прадпрыемстваў, у тым ліку гэта 83 аб'екты прыватызацыі, не прададзеныя раней, паведаміў намеснік прэм'ер-міністра. «Улічваючы, што ўключаныя ў гэты план прадпрыемствы адносяцца ў асноўным да малаэфектыўных, у тым ліку да стратных, відавочна, што зноў могуць узнікнуць тыя ж праблемы з рэалізацыяй дзяржаўных пакетаў акцый гэтых таварыстваў. Як будзе вырашацца гэта задача? Неабходна выпрацаваць эфектыўны механізм ужо сёння. Урад гатовы разгледзець абгрунтаваныя прапановы. Галоўнае — паскорыць работу дзяржаўных органаў пры прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў», — сказаў ён.

Закранаючы пералік аб'ектаў, прыватызацыя якіх дасць магчымасць у 2012 годзе прыцягнуць не менш як $2,5 млрд, Сяргей Румас адзначыў: «Гэта пытанне даволі складанае і неадназначнае, але яго трэба вырашаць. У суботу на нарадзе ў прэм'ер-міністра мы павінны ўнесці ўзгоднены і прапрацаваны пералік».

Закрануў намеснік прэм'ер-міністра і пытанне ўключэння ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці. У 2011 годзе па рэспубліканскай уласнасці ўключаны ў гаспадарчы абарот 61 працэнт ад запланаванага. «Гэта сведчыць аб адсутнасці механізму паслядоўнага вызвалення ад неэфектыўнай і невыкарыстоўваемай маёмасці. У гэтай частцы Дзяржкаммаёмасці неабходна пераходзіць да пазіцыі лідара і заняць месца асноўнага дзяржаўнага органа па каардынацыі і актывізацыі гэтай дзейнасці, стаць ініцыятарам фарміравання новых механізмаў рэгулявання гэтага пытання», — сказаў Сяргей Румас. Ён нагадаў аб задачы поўнага ўключэння ў 2012 годзе ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці і яе эфектыўнага выкарыстання.

Віцэ-прэм'ер таксама закрануў праблему выкарыстання аб'ектаў былых ваенных гарадкоў, колькасць якіх вялікая. У 2011 годзе план выкананы толькі на 62 працэнты. «Неабходна шукаць шляхі больш актыўнага прыцягнення недзяржаўных структур у развіццё гэтых адасобленых тэрыторый. Урад чакае ад Дзяржкаммаёмасці прапаноў па прыцягненні інвестараў з выкарыстаннем асаблівых умоў комплекснага задзейнічання такіх аб'ектаў», — адзначыў Сяргей Румас. Падобныя праблемы выяўляюцца пры навядзенні парадку на тэрыторыі былых піянерскіх лагераў і месцаў адпачынку.

Не варта пускаць на самацёк і пытанні ўзаемадзеяння з прадпрымальніцкімі структурамі, лічыць ён. «Дзяржкаммаёмасці сумесна з дзяржорганамі неабходна канструктыўна прапрацоўваць кожную прапанову бізнэс-саюзаў па арганізацыі дзейнасці на канкрэтных аб'ектах у цесным узаемадзеянні з прадпрымальнікамі, гатовымі выкарыстоўваць гэтыя аб'екты», — сказаў Сяргей Румас.

Стыхія

## БЕЛАРУСЬ З МАРАЗАМІ СПРАЎЛЯЕЦЦА

**Прычым без катастрафічных наступстваў, канстатуюць у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. Аператыўная абстаноўка ў краіне сведчыць: камунальныя, аварыйныя службы, энергетыкі аказаліся падрыхтаванымі да неспрыяльных умоў надвор'я.**

Усе сістэмы жыццязабеспячэння працуюць у нармальным рэжыме, а калі і ўзнікаюць нештатныя сітуацыі, дык яны ліквідуюцца ў кароткія тэрміны. Напрыклад, толькі за адны суткі былі аператыўна ліквідаваны пашкоджанні паветраных ліній электраперадач у Мастоўскім, Маларыцкім, Мінскім раёнах. У Ляхавіцкім раёне камунальнікі хутка выправілі наступствы прарыву трубаправоду халоднага забеспячэння. Статыстыка пажараў сведчыць пра тое, што большасць грамадзян прыслухаліся да рэкамендацый Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. За апошні час колькасць пажараў па прычыне парушэння правілаў эксплуатацыі пячнога ацяплення было мінімальным.

Разам з тым МНС заклікае не страчваць асцярожнасці і быць пільнымі і ўважлівымі. Стала дрэнна чалавеку на вуліцы — выклікайце «хуткую дапамогу». Падазроная асоба імкнецца патрапіць у падвал ці на гарышча дома — звяртайцеся ў ЖЭС. Не адмаўляйце ў дапамозе аўтамабілісту, чыя машына заглухла. Наша бяспека — у нашых руках!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗАНЯТКІ АДМЯНЯЮЦЦА

**У Магілёўскай вобласці 2 лютага ў сувязі з узмацненнем маразоў часова прыпынены заняткі болей чым у 70-ці школах. Пазапланавыя вакацыі аб'яўлены ў навучальных установах Бялыніцкага, Глускага, Мсціслаўскага і Крычаўскага раёнаў, а таксама ў пачатковых класах 12-ці школ Кіраўскага раёна і школе ў вёсцы Бароньki Касцюковіцкага раёна.**

Сёння, 3 лютага, да іх далучаюцца школы Горацкага, Дрыбінскага і Шклоўскага раёнаў, а таксама 7 устаноў адукацыі Бабруйскага раёна.

У абласным цэнтры працуюць усе школы, хоць на заняткі не прыйшла ў чацвер прыкладна трэцяя частка вучняў. Іх бацькі лічаць, што ў такое надвор'е лепей пабыць дома. Аднак увогуле навучальны працэс не прыпынялі спецыяльна, бо многія дарослыя проста не маюць магчымасці пакінуць школьнікаў адных дома, і такіх дзяцей школы заўсёды гатовы прыняць.

Дарэчы, 2 лютага ў Магілёўскай вобласці зафіксаваны новы тэмпературны рэкорд: на метэастанцыі ў Клічаве быў 31 градус марозу. Аднак ужо ў нядзелю ў рэгіёне чакаецца некаторае павышэнне тэмпературы паветра, і ўсе школьнікі з панядзелка, хутчэй за ўсё, вернуцца за парты.

**Ілона ІВАНОВА.**

## КУБАК ГАРБАТЫ ДЛЯ «ЗАМАРОЖАНАГА» ПЕШАХОДА

**Дзяржаўтаінспекцыя арыентаваная на аказанне дапамогі ўдзельнікам дарожнага руху, якія трапілі на дарозе ў цяжкае становішча. Па інфармацыі УДАІ МУС, супрацоўнікі аўтаінспекцыі штодзень аказваюць дапамогу больш як 30 пешаходам (іх падвозяць, пояць гарбатай) і больш як 60 кіроўцам, транспартныя сродкі якіх «замерзлі», і яны вымушаны былі спыніцца на аўтадарогах.**

Адначасова ДАІ заклікае пешаходаў быць гранічна пільнымі пры дарожным руху. Чакаючы грамадскі транспарт ці зялёнае святло святлафора на пераходзе, лепш трымацца далей ад краю праезнай часткі, каб пазбегнуць падзення пад транспарт са слізкага бардзюра. Тым больш што чалавека могуць незнарок пхнуць. Цёплая вопратка, шапкі і капюшоны робяць пешаходаў непаваротлівымі,




перашкаджаюць ім чуць аўтамабіль, які набліжаецца, кантраляваць дарожную сітуацыю. Таму не трэба рызыкаваць, перабягаючы дарогу, нават калі здаецца, што аўтамабіль яшчэ далёка. Дарогу трэба пераходзіць у вызначаных месцах, прычым лепш пераканацца, што кіроўцы заўважылі пешахода: часам на слізкай дарозе аўтамабіль немагчыма своечасова спыніць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Аляксандр ЯКАБСОН:

## «НАША ЗАДАЧА — НЕ «ПАЛАЧНАЯ» СІСТЭМА, А ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЭКАНАМІЧНАЙ БЯСПЕКІ ДЗЯРЖАВЫ»

**СТАРШЫНЯ Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Якабсон перад пачаткам выніковай калегіі Камітэта сустрэўся з журналістамі і прывёў перайначаную прытчу пра будаўнічую пляцоўку: «Наймальнік, жадаючы ўзвесці нейкую пабудову, прыйшоў на будаўнічую пляцоўку выбіраць сабе муляра. Падыходзіць да першага і пытаецца:**

**— Што ты робіш?**

**— Працую!**

**— А ты што робіш? — спытаў наймальнік другога.**

**— Узводжу сцены.**

**— Ну а ты чым займаешся? — спытаў ён трэцяга.**

**— Будую храм.**

**Гэтага і выбраў сабе наймальнік для працы».**

— Вось і мы ў Камітэце Дзяржкантролю імкнёмся не проста працаваць дзеля працы, і наша задача не стварыць «палачную» сістэму, а пабудаваць такую сістэму кантрольнай дзейнасці, якая забяспечвала б эканамічную бяспеку беларускай дзяржавы і прадухіляла любыя замахі на разбазарванне бюджэтных сродкаў, — **правёў аналогію кіраўнік галоўнага кантрольнага ведамства краіны.** — Мы робім гэта, паставіўшы ў аснову аналітыку. Другі важны складнік нашай дзейнасці — папярэджанне. Такія мэты вызначаны ў Дэкрэце №4, і мы імі кіруемся.

Дамінанта, якую мы вызначылі для сябе ў прафілактычным кантролі, не прымусіла чакаць вынікаў. Летась мы прадухілілі страту дзяржаўных сродкаў больш чым на 200 млрд рублёў — у 2,4 раза больш, чым у 2010 годзе.

Падчас непасрэдна кантрольных мерапрыемстваў для нас самае галоўнае — эканамічная эфектыўнасць . За апошні год яна, у разліку на адну праверку, вырасла на 40% — таксама досыць значны вынік. Акрамя вяртання грошай дзяржаве, мы займаемся яшчэ і вяртаннем актываў: няўлічаных дзяржаўных маёмасці і абсталявання — на суму больш за 500 млрд рублёў у 2011 годзе.

Што тычыцца аналітыкі, то летась мы ўнеслі каля 180 прапаноў у заканадаўства Беларусі, з іх каля 80 ужо прынятыя, а астатнія абмяркоўваюцца.

Таму 2011 год можна назваць годам рэканструкцыі нашай сістэмы кантрольнай дзейнасці. Безумоўна, не ўсё нам удаецца, і сёння мы будзем абмяркоўваць — чаму.

**— Якія задачы ў бягучым годзе будзе вырашаць Камітэт?**

— Сёлета мы павінны карэнным чынам паўплываць на заканадаўства: дапрацоўкі патрабуе 510-ы ўказ, мы ўжо выбудавалі сістэму сваёй працы, цяпер яе трэба замацаваць у нарматыўных актах.

У 2012 годзе мы будзем укараняць элементы аўдытаэфектыўнасці. Гэта значыць, што мы, калі прыходзім на нейкае прадпрыемства, павінны бачыць, які будзе канчатковы вынік выканання той або іншай дзяржаўнай праграмы або плана. Мы толькі ў пачатку шляху і вучымся сёння гэтай складанай рабоце, правялі буйны семінар з удзелам Міністэрства фінансаў і Міністэрства эканомікі.

Трэцяя задача на гэты год — доўгатэрміновае планаванне. Не павінна быць так, каб Камітэт дзяржкантролю планаваў працу толькі на паўгоддзе. Мы павінны бачыць, як будзем будаваць сваю дзейнасць праз год, два і на пяцігодку.

**— Ці змянілася што-небудзь у практыцы і стратэгіі ведамства ў сувязі з пачаткам дзеяння Адзінай эканамічнай прасторы?**

— На 14 лютага ў Мінску запланавана сумесная калегія Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь і Падліковай палаты Расійскай Федэрацыі. Акрамя падвядзення вынікаў мінулага года па выкананні Саюзнага бюджэту, мы абмяркуем і тое, як будзем працаваць ва ўмовах Мытнага саюза.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Домрачава зноў на п'едэстале

**У нарвежскім Халменколене 2 лютага стартаваў сёмы этап Кубка свету, дзе Дар'я Домрачава зноў паднялася на п'едэстал. Апярэдзіць асноўную суперніцу — немку Магдалену Нойнер — у спрынце Дар'я не здолела, але заняла другое месца.**

Беларуска на нуль прайшла першую стральбу і да другога агнявога рубяжа не саступала Нойнер у хуткасці. А вось падчас стральбы стоячы Домрачава дапусціла адзін промах, у той час як немка адстралялася на нуль. У выніку на фінішны круг Дар'я выйшла, саступаючы Нойнер 27 секундаў. На апошнім крузе беларуска яшчэ 11 секундаў саступіла лідару. Але другое месца за сабой усё ж захавала.

Такім чынам, у стартавай гонцы сёмага этапа, спрынце, Дар'я Домрачава выступіла не так бліскуча, як у папярэдняй гонцы на шостым этапе, дзе яна была найлепшай і ў стральбе, і ў хуткасці. Тым не менш, гэта дзявятае прызавое месца беларускі ў сезоне. Яна па-ранейшаму на другім месцы ў агульным заліку Кубка свету пасля Магдалены Нойнер.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СІБІРСКІЯ ХАЛАДЫ ПАРАЛІЗУЮЦЬ ЕЎРОПУ

**Моцныя снегапады ў Еўропе — ад Італіі на поўдні да Турцыі на ўсходзе — прывялі да збояў у руху аўтамабільнага і авіяцыйнага транспарту, а таксама да парушэнняў у вода- і электразабеспячэнні.**

Ад холаду загінула ўжо не менш за 80 чалавек, у асноўным у Польшчы і ва Украіне. Больш як 600 мясцовым жыхарам спатрэбілася медыцынская дапамога з-за пераахаладжэння і абмаражэнняў.

У цэнтральных раёнах Італіі вялікагрузным грузавікам забаронены выезд на дарогі, адменена некалькі футбольных матчаў італьянскай вышэйшай футбольнай лігі. На поўначы Грэцыі, як і ва Украіне, закрыты школы.

На паўночным усходзе Балгарыі зафіксаваныя рэкордныя халады — у раёне горада Кнежа ўжо другія суткі адзначаецца тэмпература мінус 29 градусаў. Там таксама ўжо другі тыдзень не працуюць школы, паведамляецца аб смерці сярод пажылых людзей у мясцовых вёсках.

Уздоўж румынскага ўзбярэжжа замерзла Чорнае мора, што здараецца вельмі рэдка.

### ЭКАНАМІЧНЫ СПАД ПАЧАЎСЯ З БЕЛЬГІІ



**Бельгія стала першай краінай зоны еўра, якая афіцыйна ўступіла ў фазу эканамічнага спаду. У чацвёртым квартале мінулага года ВУП каралеўства знізіўся на 0,2%, сведчаць апублікаваныя звесткі.**

На думку аналітыкаў, пачатак рэцэсіі ў эканоміцы Бельгіі з'яўляецца прадвесцем эканамічнага спаду, які сёлета пагражае ахапіць усю еўразону. Падставай для такіх прагнозаў з'яўляецца бюджэтны крызіс, што перажывае зона адзінай валюты, а таксама меры жорсткай бюджэтнай эканоміі, што прымаюцца ўрадамі яе краін.

Згодна з прагнозам шэрагу вядучых экспертаў-эканамістаў, сёлета сукупны ВУП краін зоны еўра скароціцца на 0,3%.

### РАЗВЕДКА ІЗРАІЛЯ: ІРАН НАЗАПАСІЎ УРАНУ НА ЧАТЫРЫ АТАМНЫЯ ЗАРАДЫ



**Іран сёння валодае такой колькасцю ўзбагачанага ўрану, якога хопіць для стварэння чатырох атамных бомбаў, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на кіраўніка ваеннай разведкі Ізраіля Авіва Кахаві. Гэтым можна растлумачыць перакідванне падраздзяленняў ВПС, ВМФ і сухапутных войскаў ЗША і іх саюзнікаў да межаў Ірана, якое назіраецца ў апошні час.**

Выступаючы на канферэнцыі ў горадзе Герцлія Кахаві заявіў, што вярхоўны лідар Ірана аятала Алі Хаменеі аддаў загад пачаць узбагачэнне ўрану да зброевага ўзроўню. Тэгерану спатрэбіцца адзін год для стварэння «сырой» прылады і яшчэ адзін-два гады для стварэння ядзернай боегалоўкі, якую можна будзе ўсталяваць на балістычную ракету.

На гэтым фоне Вашынгтон і яго саюзнікі пачынаюць перакідваць свае войскі ў раён Персідскага заліва. Паводле апошніх звестак, Вашынгтон размясціў на авіябазе «Аль-Убейд» у Катары эскадрыллю стратэгічных бамбавікоў В-1В у колькасці не менш за шэсць машын. Прыходзяць звесткі аб тым, што на амерыканскую базу, размешчаную на брытанскім востраве Дыега-Гарсія ў Індыйскім акіяне, завезены сотні бетонабойных бомбаў, здольных знішчаць добра ўмацаваныя падземныя бункеры.

Акрамя гэтага, у раёне Персідскага заліва нясуць дзяжурства дзве амерыканскія авіяносныя ўдарныя групы. Чакаецца, што ў сакавіку да іх далучыцца яшчэ адзін авіяносец ЗША — Enterprise. А ў канцы студзеня стала вядома, што з Міжземнага ў Чырвонае мора ўвайшлі амерыканская атамная субмарына Annapolis і эскадраны мінаносец Momsen. Відаць, у выпадку ваеннай аперацыі супраць Ірана не застануцца ў баку Брытанія і Францыя. Яны таксама пачалі перакідваць свае войскі ў Саудаўскую Аравію і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.

## Даведка аб даходах цяпер мае адзіную форму

**Пісьмо з адпаведнай прапановай 1 лютага Нацыянальны банк Беларусі накіраваў камерцыйным банкам, паведамляе ўпраўленне інфармацыі Нацбанка. Новая адзіная форма бланка даведкі аб даходах фізічнай асобы, якая падаецца ў банк для атрымання крэдыту, размешчана на сайце галоўнага банка краіны.**

Раней, згодна з пунктам 6 Інструкцыі аб парадку прадастаўлення (размяшчэння) банкамі грашовых сродкаў у форме крэдыту і іх вяртання (зацверджана пастановай праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2003 года № 226), пералік дакументаў, якія падаваліся фізічнай асобай у банк для атрымання крэдыту, а таксама форма гэтых дакументаў вызначаліся лакальнымі нарматыўнымі праваўымі актамі, зацверджанымі ўпаўнаважаным органам банка. Такім чынам, кожны банк прапаноўваў для запаўнення сваю форму даведкі аб даходах фізічнай асобы для ацэнкі яго крэдытаздольнасці. Нацбанк сумесна з Асацыяцыяй беларускіх банкаў арганізаваў абмеркаванне з банкамі гэтай праблемы. У выніку апошнім накіраваны рэкамендацыі аб выкарыстанні ў дачыненні да фізічных асоб, што працуюць па найме, адзінай формы бланка даведкі аб даходах. Гэта дазволіць спрасціць падрыхтоўку дакументаў пры крэдытаванні.

Адначасова Нацыянальны банк апавясціў банкі аб тым, што яго пісьмо ад 25 чэрвеня 2007 года №19-18/80 «Аб банкаўскай гарантыі» больш не прымяняецца з-за страты актуальнасці. Зараз магчымасць прадастаўлення банкамі гарантый у забеспячэнні выплаты мытных пошлін і падаткаў прадугледжана заканадаўствам Мытнага саюза ў межах Еўразійскай эканамічнай супольнасці, а таксама заканадаўствам Рэспублікі Беларусь па пытаннях мытнага рэгулявання.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**




ISSN 1990 - 763X

**КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ, УСТАНОЎЛЕНЫЯ НБ РБ з 03.02.2012 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲1 долар ЗША | 8 410,00 | 1 чэшская крона | 439,08 |
| ▲1 еўра | 11 080,00 | 1 польскі злоты | 2 640,09 |
| 1 латвійскі лат | 15 797,88 | ▲1 расійскі рубель | 279,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 204,66 | 1 украінская грыўня | 1 046,54 |

**КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ ДЛЯ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ ЦЭНТРАБАНК РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,1855 |
| 10 UAH | 37,5474 |
| 10000 BYR | 36,0209 |
| EUR | 39,7664 |

Прамая лінія

# У ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ ЁСЦЬ ДАДАТКОВЫЯ ПРАВЫ

**Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама рэгулярна праводзіць прамыя тэлефонныя лініі з гараджанамі. Тэмай адной з нядаўніх гутарак стаў «Асаблівасці рэгулявання працы моладзі». Мы выбралі некалькі пытанняў да спецыялістаў, адказы на якія, думаецца, будуць цікавымі і нашым чытачам.**

❒ ***У мяне двое дзяцей, і я хацела б ведаць, з якога ўзросту яны могуць уладкавацца на працу? (Марыя К.)***

У адпаведнасці з арт. 272 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь не дапускаецца заключэнне працоўнага дагавора з асобамі, маладзейшымі за 16 гадоў.

З пісьмовай згоды аднаго з бацькоў (усынавіцеляў, папячыцеляў) працоўны дагавор можа быць заключаны з асобай, якая дасягнула 14 гадоў, — для выканання лёгкай працы, якая не з'яўляецца шкоднай для здароўя і развіцця, а таксама не наносіць шкоды вучобе.

❒ ***Майму сыну 17 гадоў. Ён працуе па працоўным дагаворы ў адной з арганізацый прыватнай формы ўласнасці Мінска. Пры складанні графіка працоўных адпачынкаў наймальнік настойвае на прадастаўленні яму водпуску толькі ў зімовы ці асенні перыяд. Ці правамерныя дзеянні наймальніка? (Юлія Іванаўна).***

Дзеянні наймальніка неправамерныя. Згодна з арт. 277 Працоўнага кодэкса РБ працоўны адпачынак работнікам, маладзейшым за 18 гадоў, прадастаўляецца ў летні час або, па іх жаданні, у любы іншы час года.

❒ ***Ці прадугледжана для моладзі скарочаная працягласць рабочага часу і як ён павінен аплачвацца? (Кацярына).***

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 114 Працоўнага кодэкса РБ, для работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, вызначаецца скарочаная працягласць рабочага часу:

— ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — не больш за 23 гадзіны на тыдзень;

— ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — не больш за 35 гадзін на тыдзень.

Пры гэтым, згодна з арт. 279 Працоўнага кодэкса РБ, заработная плата работнікам, маладзейшым за 18 гадоў, пры скарочанай працягласці штодзённай працы выплачваецца ў такім жа памеры, як работнікам адпаведных катэгорый пры поўнай працягласці штодзённай працы.

Праца работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, дапушчаных да здзельных работ, аплачваецца па здзельных расцэнках, устаноўленых для дарослых работнікаў, з даплатай па тарыфнай стаўцы за час, на які працягласць іх штодзённай працы скарачаецца ў параўнанні з працягласцю штодзённай працы дарослых работнікаў.

Аплата працы навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў, а таксама ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія працуюць у вольны ад вучобы час, праводзіцца прапарцыянальна адпрацаванаму часу або ў залежнасці ад выпрацоўкі. Наймальнікі могуць вызначаць навучэнцам даплаты да заработнай платы.

❒ ***Маёй дачцэ 17 гадоў. Яна працуе ў гандлёвым аб'екце прыватнай формы ўласнасці. Кіраўніцтва гандлёвага аб'екта просіць выходзіць на працу ў суботу і нядзелю. Ці мае рацыю наймальнік? (Юлія).***

Згодна з арт. 276 Працоўнага кодэкса РБ, забараняецца прыцягваць работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, да начных і звышурочных работ, работ у дзяржаўныя святы і святочныя дні, а таксама ў выхадныя.

Разам з тым варта адзначыць, што, у адпаведнасці з арт.141 Працоўнага кодэкса РБ, у арганізацыях, якія пастаянна абслугоўваюць насельніцтва ў суботы і нядзелі (гандаль, бытавое абслугоўванне, тэатры, кінатэатры, музеі і інш), выхадны дзень (выхадныя дні) вызначаецца ў другі дзень тыдня ў парадку, прадугледжаным Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, і з улікам рэкамендацый мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

**Святлана БУСЬКО.**

Зала калегіі

# «Краіне патрэбныя і «залатыя» мазгі, і «залатыя» рукі...»

**«КРЫТЭРЫЕМ эфектыўнасці работы школ не можа выступаць такі паказчык, як колькасць выпускнікоў, якія сталі студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў, — такую думку выказаў віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК, які прымаў удзел у выніковай калегіі Міністэрства адукацыі. — Ацэньваць работу школ трэба па колькасці выпускнікоў, якія ўладкаваліся ў жыцці і змаглі сябе рэалізаваць. Давайце разам шчыра адкажам на пытанне: а ці патрэбна нашай краіне столькі студэнтаў? Чаму 30 гадоў таму, калі савецкая сістэма адукацыі афіцыйна прызнавалася адной з лепшых у свеце, у ВНУ ішлі пасля школы толькі 20 працэнтаў выпускнікоў, а сёння — 60? Чаму ў педагагічны ўніверсітэт мы прымаем на бюджэт абітурыентаў з агульнай сумай (тры сертыфікаты плюс сярэдні бал атэстата) 15-16 балаў з 400 магчымых? А на платную форму навучання паступаюць абітурыенты і ўвогуле з адным балам у сертыфікаце?**

Па словах Анатоля Тозіка, калі некалькі гадоў таму сярэдні бал атэстата абітурыента стаў прыраўноўвацца да чацвёртай экзаменацыйнай адзнакі, меркавалася, што такім чынам удасца павысіць увагу старшкакласнікаў да ўсіх школьных прадметаў, а не толькі да аднаго-двух. Аднак што атрымалася ў рэчаіснасці? Сярэдні бал атэстата зусім не адпавядае рэальнаму ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка правялі кантрольны зрэз ведаў першакурснікаў, вынікі якога аказаліся вельмі красамоўныя. Так, сярэдні бал удзельнікаў кантрольнай работы па матэматыцы склаў 1,73 па 10-бальнай шкале. Сярэдні бал сертыфікатаў па тым жа прадмеце — 17,79 (па 100-бальнай шкале), а сярэдні бал у школьным атэстаце па матэматыцы — 7,38. Сярэдні бал удзельнікаў кантрольнай работы па фізіцы быў 1,8, сярэдні бал сертыфікатаў ЦТ — 16,32, а бал у атэстатах — 6,72.

— Я лічу, што яшчэ да 9-га класа трэба вельмі сур'ёзна працаваць з дзецьмі, каб дапамагчы ім вызначыцца з тым, як яны будуць рэалізоўваць сябе: праз «залатыя» мазгі, або праз «залатыя» рукі. Трэба мяняць устойлівае меркаванне аб тым, што толькі дыплом аб вышэйшай адукацыі гарантуе поспех у жыцці. Краіне патрэбныя і добрыя інжынеры, і рабочая інтэлігенцыя ў аднолькавай ступені, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Асобна Анатоль Тозік спыніўся на фінансаванні сістэмы адукацыі:

— Я абсалютна ўпэўнены, што сёння ніхто эканомікай у адукацыйнай галіне не займаецца. Па маім меркаванні, не менш як 25 працэнтаў рэсурсаў, што накіроўваюцца дзяржавай у сферу адукацыі, выкарыстоўваюцца не па-гаспадарчы, а, прасцей кажучы, марна. Няўжо гэта нармальна, калі ў сельскай школе ў першым або другім класе ўсяго адзін вучань? А ў 10-м класе да аднаго вучня прыходзяць у школу адразу 6 настаўнікаў? А побач, за 6-7 кіламетраў, ёсць паўнацэнная школа, і 4 разы на дзень у гэты населены пункт ходзіць рэйсавы аўтобус? Ёсць аналагічныя прыклады і па гарадскіх школах, дзе 19, 20, 24 вучні падзелены на два класы ў паралелі. А ёсць гарадская школа, дзе ў двух адзінаццатых класах навучаюцца па 5 чалавек! Я разумею, што мясцовым органам кіравання адукацыяй хочацца, каб і ў настаўнікаў работа была, і ў абслуговага персаналу. Аднак няўжо мы такія багатыя? Навошта нам такія раздутыя штаты ў інстытутах развіцця адукацыі? У Мінскім гарадскім — 293 чалавекі, у Мінскім абласным — 292...

Можа, трэба падумаць аб змяненнях у сістэме фінансавання сярэдняй адукацыі, каб грошы ішлі за вучнем? Лічу, што калі мы зможам забяспечыць годную зарплату настаўнікам, то ў нас не будзе такой цякучасці кадраў у галіне. І не будуць 40 працэнтаў маладых спецыялістаў зыходзіць з прафесіі пасля двух-трох гадоў работы пасля заканчэння ВНУ. І ў гэтым выпадку мы зможам зменшыць колькасць набору на педагагічныя спецыяльнасці...

— Сёння вельмі шмат нехарактэрных функцый перакладзена на школу. Шмат у школе папяровай валакіты. Прычым заўважана, што чым больш мы разважаем пра неабходнасць змяншэння папяровага бюракратызму, тым хутчэй яго аб'ёмы растуць. Трэба тэрмінова з гэтым штосьці рабіць. Трэба перагледзець і памеры даплат настаўнікам у залежнасці ад той ці іншай кваліфікацыйнай катэгорыі. Трэба ўвесці, нарэшце, пасаду настаўніка-метадыста. Але я асабіста супраць увядзення асобнай пасады класнага кіраўніка, — дадаў Анатоль Тозік.

«Задача павышэння якасці адукацыі застаецца адной з самых актуальных для нашай школы, — заявіў на выніковай калегіі свайго ведамства **міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.** — На жаль, узровень ведаў абітурыентаў па дзяржаўных мовах, матэматыцы і фізіцы хоць і супастаўны з паказчыкамі многіх еўрапейскіх краін, аднак усё роўна застаецца адносна невысокім. Аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання выявіў у ведах многіх абітурыентаў шэраг прабелаў, якіх у прынцыпе быць не павінна. Упраўленні адукацыі сумесна з Нацыянальным інстытутам адукацыі павінны разабрацца ў прычынах памылак, якія абітурыенты дапускаюць, адказваючы на элементарныя пытанні ў тэстах, і прапанаваць дзейсныя захады па выпраўленні сітуацыі».

> **«Аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання выявіў у ведах многіх абітурыентаў шэраг прабелаў, якіх у прынцыпе быць не павінна».**

На думку міністра адукацыі, у вялікай ступені вынікі работы ўстаноў адукацыі залежаць ад сістэмы падбору, падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў:

— У той жа час мы бачым, што ўзровень падрыхтоўкі выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцей адстае ад патрабаванняў, што да іх прад'яўляюцца. Можна меркаваць, што гэта абумоўлена як недастатковым узроўнем падрыхтоўкі абітурыентаў, што становяцца студэнтамі ВНУ, так і якасцю навучальнага працэсу ў вышэйшых навучальных установах. Выпускнік педагагічнай ВНУ (і гэта аксіёма) павінен дасканала валодаць сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі і методыкамі, а прафесійныя ўменні, навыкі і базавыя кампетэнцыі, засвоеныя падчас навучання, павінны забяспечваць прафесійнае станаўленне маладога спецыяліста ў максімальна сціслыя тэрміны. З улікам такіх падыходаў ужо да новага навучальнага года адукацыйныя стандарты, вучэбныя планы і праграмы навучання на педагагічных спецыяльнасцях і спецыялізацыях павінны быць перагледжаны і істотна абноўлены. Трэба падрабязна разабрацца па ўсім комплексе пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай спецыялістаў педагагічнага профілю. Мы таксама чакаем канкрэтных прапаноў па аптымізацыі тэрмінаў падрыхтоўкі спецыялістаў, узмацненні практычнага складніка падрыхтоўкі педагагічных кадраў, а таксама па пытаннях адбору абітурыентаў на педагагічныя спецыяльнасці.

У бягучым годзе на педагагічных спецыяльнасцях навучаецца амаль 58 тысяч чалавек. Думаем, што з улікам аптымізацыі сеткі і структуры ўстаноў адукацыі, спыненне падрыхтоўкі педагагічных кадраў па незапатрабаваных спецыяльнасцях і спецыялізацыях, аб'ёмы падрыхтоўкі педагогаў могуць быць істотна скарочаны.

Кіраўніцтва Міністэрства адукацыі ўпэўнена, што трэба ўстанавіць больш высокія патрабаванні да ацэнкі прафесійнай кампетэнцыі педагогаў і падрыхтаваць новую рэдакцыю Палажэння аб атэстацыі педагагічных работнікаў (за выключэннем работнікаў ВНУ). У прыватнасці, трэба ўстанавіць перыядычнасць пацвярджэння педагагічнымі работнікамі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Сяргей Маскевіч паабяцаў, што пытанні паэтапнага павышэння заробкаў педагагічных работнікаў будуць пастаянна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі кіраўнікоў галіны. Аднак гэтыя пытанні трэба разглядаць у адной звязцы з удасканальваннем сістэмы аплаты працы і павышэння эфектыўнасці работы педагогаў. Як вядома, у Міністэрстве адукацыі працуе рабочая група па вывучэнні пытанняў магчымага пераходу на іншую сістэму аплаты працы педагогаў. І як варыянт разглядаецца пераход да штатна-акладнай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў.

Сваім бачаннем сітуацыі падзялілася з удзельнікамі калегіі **дырэктар гімназіі №13 г. Мінска Вольга ЧАРНАВУСАВА:**

— На нашу думку, павысіць заработную плату настаўнікам можна шляхам увядзення істотных даплат і павышальных каэфіцыентаў. А вывучэнне штатна-акладнай сістэмы пераконвае нас у тым, што яна не прывядзе да павышэння заробкаў. На сённяшні дзень павялічэнне заробку ўвязваецца з павелічэннем колькасці ўрокаў, але пры гэтым не бяруцца пад увагу якасныя паказчыкі работы. Мы перакананыя ў тым, што ў аснову новай сістэмы аплаты працы павінна быць пакладзена якасць выкладання. Увядзенне звання настаўніка-метадыста з адпаведнай даплатай захавае для школы прафесіяналаў, педагогаў-наватараў, адным словам, наш «залаты фонд». Наступны важны момант у павышэнні якасці работы настаўніка — атэстацыя, якая фактычна ператварылася ў інструмент выключна маральнага, а не матэрыяльнага стымулявання. Мінімальная грашовая розніца паміж тарыфнымі каэфіцыентамі дзвюх сумежных кваліфікацыйных катэгорый ні ў якай ступені не стымулюе настаўніка да росту творчага патэнцыялу і павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі. А за званні «Выдатнік адукацыі» і «Заслужаны настаўнік» і ўвогуле даплат не існуе. Упэўнены, што аплату працы настаўнікаў розных катэгорый трэба дыферэнцыяваць у большай ступені.

> **«Пазаўрочная, пазашкольная і выхаваўчая работа вымагае значна больш часу, чым 3-5 гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы на тыдзень, якія падлягаюць аплаце...».**

Ёсць таксама прапанова павялічыць работу на стаўку да 20 гадзін на тыдзень.

— У рэчаіснасці павелічэнне стаўкі да 20 гадзін прывядзе не да павелічэння, а да змяншэння заробкаў настаўнікаў, — падкрэсліла Вольга Чарнавусава. — У педагагічным асяроддзі прапануецца кампраміснае рашэнне — павялічваць гадзіны адпрацоўкі на стаўку ў залежнасці ад рангавай шкалы вучэбных прадметаў. У прыватнасці, стаўка для настаўнікаў, якія выкладаюць матэматыку, мовы, фізіку, хімію і іншыя прадметы, што цягнуць за сабой цэлы «шлейф» абавязкаў, павінна складаць 18 гадзін, як і раней, а па такіх прадметах, як працоўнае навучанне, выяўленчае мастацтва, фізкультура і г. д. — 20 гадзін.

Па словах дырэктара сталічнай гімназіі, шмат спрэчак у працоўных калектывах узнікае з-за класнага кіраўніцтва. Усе ведаюць, што пазаўрочная, пазашкольная і выхаваўчая работа вымагае значна больш часу, чым 3-5 гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы на тыдзень, якія падлягаюць аплаце. Аналагічная сітуацыя і з праверкай пісьмовых работ. Аплата гэтай карпатлівай працы ніколькі не адпавядала фактычным выдаткам часу. Ёсць неабходнасць перагледзець і тарыфныя разрады кіраўнікоў устаноў адукацыі. Зараз гадзіна працы кіраўніка ўдвая таннейшая, чым гадзіна працы настаўніка. Павелічэнне розніцы паміж акладам дырэктара і настаўніка магло б падняць прэстыжнасць работы кіраўніка.

Асаблівы клопат патрабуецца маладым педагогам, якія прыходзяць у школы. Пасля двух гадоў работы па размеркаванні яны пазбаўляюцца даплат, якія належаць маладым спецыялістам. І нават своечасовае прысваенне ім другой катэгорыі не кампенсуе даплату, якую яны раней атрымлівалі. Між іншым, менавіта ў гэты час маладыя людзі ствараюць уласныя сем'і...

— Павысіць узровень аплаты працы настаўнікаў у першыя пяць гадоў, каб затрымаць іх у школе, — гэта наш маральны доўг, — дадала Вольга Чарнавус.

Праблему класнага кіраўніцтва ўзняла ў сваім выступленні на калегіі і **першы намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Вера ГРЫШЭЧКА:**

— Класны кіраўнік з'яўляецца ключавой фігурай у рабоце з сям'ёй. Між іншым, такой пасады па сённяшні дзень не існуе. Пры падрыхтоўцы да калегіі мы прааналізавалі занятасць педагога, які выконвае абавязкі класнага кіраўніка з аплатай ад 3 да 5 гадзін у тыдзень. Шэраг функцый, якія ён выконвае, фактычна не аплачваюцца, я маю на ўвазе праверку дзённікаў, вядзенне класнай дакументацыі, высвятленне прычын адсутнасці вучняў на занятках, дзяжурства па школе, арганізацыю харчавання дзяцей, вывучэнне жыллёва-бытавых умоў навучэнцаў і гэтак далей. Высокія патрабаванні да прафесійных якасцяў педагога, маральныя перагрузкі, нерэгламентаванасць іх рабочага часу прыводзяць да таго, што настаўнікі не хочуць быць класнымі кіраўнікамі. Таму наша прапанова — увесці пасаду класнага кіраўніка з аплатай з разліку 9 гадзін на клас у тыдзень.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**У МОЦНЫЯ МАРАЗЫ ЛЮДЗЯМ З ПРАБЛЕМАМІ СЭРЦА І САСУДАЎ ПАЖАДАНА НЕ ВЫХОДЗІЦЬ З ДОМУ**

Кардыёлагі заклікаюць людзей з хваробамі сэрца і сасудаў у моцныя маразы заставацца дома, каб пазбегнуць прыступу стэнакардыі (кіслароднай недастатковасці).

А тым, хто па розных прычынах вымушаны пакідаць межы кватэры, лекар рэкамендуе «імгненна не выходзіць з цёплага памяшкання на мароз, а крыху пастаяць у тамбуры, каб арганізм змог адаптавацца». З сабой трэба ўзяць нітрагліцэрын ці валідол.

*Мінск-Навіны.*

## У МІНСКУ ПЕРАКУЛІЎСЯ ГРУЗАВІК З ПІВАМ

**У сталіцы на ўнутраным кальцы МКАД непадалёк ад Чыжоўкі 2 лютага перакуліўся грузавік з півам. Аўтамабіль належыць мінскаму заводу «Крыніца».**

Як паведаміла «Звяздзе» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Заводскага РУУС Мінска Анастасія Крахціна, 23-гадовы кіроўца грузавіка падчас выбару хуткасці не ўлічыў габарытаў транспартнага сродку, наяўнасці грузу і асаблівасцяў надвор'я. У выніку грузавік вынесла ў крайнюю левую паласу, дзе ён сутыкнуўся з «Вольва», урэзаўся ў раздзяляльны парапет і перакуліўся на правы бок.

Ні кіроўца, ні груз (а гэта была слабаалкагольная прадукцыя і піва) не пацярпелі. Праўда, для таго, каб падняць грузавік, піва давялося выгрузіць.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**



Абзац

**Больш за 189 тыс. пасажыраў было аштрафавана ў Мінску за безбілетны праезд у гарадскім грамадскім транспарце ў мінулым годзе. Агульная сума штрафаў склала больш за 1 млрд 328 млн рублёў.**

Поўны абзац

Сімвал Бруселя, вядомы на ўвесь свет фантан «Хлопчык, які сікае» («Маннекен-піс»), часова спыніў функцыянаванне з-за магчымых істотных замаразкаў. Згодна з прагнозамі сіноптыкаў, тэмпература ў бельгійскай сталіцы можа апусціцца да мінус 10 градусаў, што значна ніжэй за сярэдні для Бруселя лютаўскі мінімум. У сувязі з гэтым улады горада прынялі рашэнне часова спыніць падачу вады да славутага хлопчыка, бо ёсць небяспека, што замерзлая вада пашкодзіць механізмы фантана.



*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Парламенцкі дзённік

# САЦЫЯЛЬНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ СТАНЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ЗАМОВАЙ

**Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання» абмеркавалі днямі на сваім пасяджэнні дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў. Папярэднічала гэтаму, яшчэ да ўнясення законапраекта ў Палату прадстаўнікоў, дзейнасць рабочай групы, у склад якой уваходзілі ГА «Грамадскае аб'яднанне інвалідаў», Праўленне Міжнароднага асветніцкага аб'яднання «АКТ», ГА «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам», прадстаўнікі розных міністэрстваў.**

Сам Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні» быў прыняты яшчэ ў 2000-м годзе. З таго часу ў сістэме сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва адбыліся істотныя змены: з'явіліся новыя ўстановы — тэрытарыяльныя цэнтры. А калі з'явіліся новыя арганізацыі, значыць, узніклі новыя тэхналогіі і віды сацыяльных паслуг. Узраслі і попыт на сацыяльнае абслугоўванне, і патрабаванні да яго якасці. Як вынік, стаў фарміравацца рынак сацыяльных паслуг, прадстаўленых дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі.

Новая рэдакцыя Закона накіравана на ўдасканаленне прававога рэгулявання ў сферы сацыяльнага абслугоўвання. У ім дадзены азначэнні некаторым новым тэрмінам. Адно з асноўных паняццяў — гэта дзяржаўная замова, што можна разумець як форму рэалізацыі сацыяльных праектаў і разавых мерапрыемстваў за кошт дзяржаўных бюджэтных сродкаў. Гэта дазволіць далучыць да дзейнасці па сацыяльным абслугоўванні насельніцтва арганізацыі ўсіх формаў уласнасці.

— Недзяржаўны сектар будуць прадстаўляць установы, якія маюць вопыт і станоўча зарэкамендавалі сябе ў сферы сацыяльнага абслугоўвання, — падкрэсліла ў гутарцы з карэспандэнтам газеты **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Алена ДЗІКАВІЦКАЯ.** — Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы на конкурснай аснове будуць заключаць з юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі дагаворы аб умовах аказання, фінансавання сацыяльных паслуг, а таксама будуць ажыццяўляць кантроль за іх дзейнасцю. Зараз на практыцы гэты пункт Закона не прымяняецца з-за адсутнасці механізмаў вылучэння сродкаў юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам для аказання насельніцтву сацыяльных паслуг, адбору выканаўцаў і ўзаемадзеяння з імі.

Дзяржаўныя сацыяльныя службы не могуць абслугоўваць катэгорыі грамадзян з пэўнымі медыцынскімі супрацьпаказаннямі — хворых на сухоты, анкалагічных, псіхічна хворых. А прыватнік зможа стварыць сваю службу, выйграць грант і аказаць дапамогу такім людзям — для гэтага і патрэбна дзяржаўная замова, мяркуе дэпутат.

Сёння існуе шмат прыватных арганізацый, якія добра падрыхтаваны, навучыліся працаваць з інвалідамі, маюць пэўную матэрыяльную базу і могуць перадаваць свой вопыт.

Пры падрыхтоўцы Закона быў вывучаны вопыт многіх краін — Кіргізіі, Нарвегіі, Расіі, Германіі. Там ёсць дзяржаўная замова, бо гэта выгадна для ўсіх: як дзяржавы, так і прыватніка, і спажыўца.

А. Дзікавіцкая паведаміла, што ў новым законапраекце сацыяльнае абслугоўванне вызначаецца як дзейнасць па арганізацыі і аказанні сацыяльных паслуг, актывізацыі ўласных намаганняў грамадзян па прадухіленні і перадоленні складанай жыццёвай сітуацыі і адаптацыі да яе.

Такім чынам, сацыяльнае абслугоўванне не абмяжоўваецца толькі дапамогай грамадзянам, якія маюць у гэтым патрэбу. У гэтае паняцце ўваходзіць дзейнасць, вынікі якой дазволяць пазбегнуць узнікнення праблемы, а пры немагчымасці вырашэння — адаптавацца да яе.

У законапраекце таксама вызначана сістэма сацыяльнага абслугоўвання, рэгламентаваныя правы і абавязкі грамадзян, удакладнены пералік арганізацый, што аказваюць сацыяльныя паслугі. У адпаведнасці з яго нормамі захаваецца прынцып добраахвотнасці: па ўласным жаданні чалавек можа як замовіць паслугу, так і адмовіцца ад яе.

— Адсутнасць многіх важных палажэнняў у Законе, што дзейнічае зараз, тармозіць развіццё сістэмы сацыяльнага абслугоўвання, — кажа Алена Дзікавіцкая. — Няма рэгламентаваных паўнамоцтваў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што не дазваляе яму прымаць нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць дзейнасць устаноў сацыяльнага абслугоўвання камунальных формаў уласнасці. А ў нас у краіне — 151 цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і 76 дамоў-інтэрнатаў. У новым законапраекце Міністэрства атрымае больш правоў, што дазволіць у поўнай меры забяспечыць дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы сацыяльнага абслугоўвання.

Парламентарый сцвярджае, што за дзесяць гадоў у сістэме сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва адбыліся істотныя змены: атрымалі актыўнае развіццё нестацыянарныя формы сацыяльнага абслугоўвання, уведзены новыя тэхналогіі аказання сацыяльных паслуг, з'явіліся абсалютна новыя ўстановы — аддзяленне тэрміновай сацыяльнай дапамогі, аддзяленне псіхалагічнай дапамогі, аддзяленне кругласутачнага, а таксама дзённага знаходжання пажылых людзей, маладых асоб з абмежаванымі магчымасцямі. «Зараз можна замовіць нават пілаванне дроў, рамонт даху і кладку печы, а таксама здаць свае рэчы ў міні-пральню», — кажа А. Дзікавіцкая.

Парламентарыі плануюць разгледзець законапраект у першым чытанні на вясенняй сесіі. А пакуль дэпутатамі сумесна з распрацоўшчыкамі вядзецца карпатлівая праца.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

На прыёме ва ўлады

# КВАТЭРНЫЯ ПЫТАННІ ПСУЮЦЬ МАГІЛЯЎЧАНАМ ЖЫЦЦЁ

**ДЛЯ шматдзетных сем'яў Магілёва, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жылля, пабудуюць сёлета асобны дом. Самыя розныя жыллёвыя праблемы дапамагаў вырашаць грамадзянам на прыёме старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.**

### ГРОШЫ НА НОВЫЯ КВАТЭРЫ

Дом на вуліцы Чэхава ў цэнтры Магілёва яшчэ толькі будуецца, але ўжо выклікае шмат спрэчак. Забудоўшчыкі ў трывозе: ім падаецца, што іх прымусяць плаціць за свае квадратныя метры вялізныя, не па кішэні, грошы. Нашмат большыя, чым яны ўжо заплацілі.

Арганізацыя, з якой будучыя кватэраўладальнікі падпісвалі дамовы яшчэ ў 2009 годзе, ужо не існуе, а Магілёўскі гарвыканкам, які быў заснавальнікам той арганізацыі, прапануе прыняць новыя дадатковыя пагадненні. Гэтыя дакументы, баяцца людзі, і дадуць магчымасць усталяваць значна вышэйшыя цэны. «Што будзе далей з намі і нашымі грашыма?» — пыталіся маладыя жанчына і мужчына, якія прыйшлі ўзяць раду кіраўніка вобласці.

Галоўнае, што дом будуецца. Менавіта такім чынам найперш супакойвалі магілёўчан, якія разлічваюць стаць у хуткім часе гаспадарамі новых апартаментаў, але ж не вечнымі плацельшчыкамі за іх пабудову.

— Да 1 ліпеня, да Дня Рэспублікі дом неабходна здаць, — сказаў Пётр Руднік. — Што датычыцца кошту квадратнага метра, то ён канчаткова вызначыцца бліжэйшым часам, калі будзе гатовы нарэшце ўвесь камплект праектна-каштарыснай дакументацыі. Акрамя гэтага, суму будзе зацвярджаць Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

Пакуль жа ўпраўленне капітальнага будаўніцтва гарвыканкама можа толькі заявіць пра сябе як пра праваперайманьніка арганізацыі, якую закрылі і якой, паводле некаторай інфармацыі, займаюцца праваахоўныя органы. І як адказны заснавальнік, гарадская ўлада павінна разгледзець пытанне пра дапамогу ў фінансаванні гэтага жылога дома, каб за кошт бюджэтных сродкаў зрабіць квадратны метр больш танным.

### ДОМ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ

На прыём прыйшла шматдзетная маці Наталля Макарэвіч. Яна працуе ў ААТ «Лаўсанбуд», жыве з мужам і 3 дзецьмі ў інтэрнаце. У кіраўніцтва вобласці просіць падтрымкі ў атрыманні большага па памеры пакоя альбо блока, каб вялікая сям'я магла жыць больш камфортна, пакуль вырашаецца пытанне пра будаўніцтва новага жылля.

Паводле заканадаўства, на кожнага члена сям'і павінна быць не менш 6 квадратных метраў жылой плошчы, а Макарэвіч мае менш. Таму прадстаўніку будаўнічага трэста прапанавалі літаральна за тыдзень знайсці жыллё большай плошчы для шматдзетнай сям'і, якую трэба падтрымліваць.

Маці таксама паскардзілася Пятру Рудніку на не самыя лепшыя ўмовы жыцця ў інтэрнаце: маўляў, краны цякуць, шыбы падаюць (аднойчы — нават на яе дзіця), са святлом перабоі. Карацей — патрэбен рамонт будынка, якому ўжо 40 гадоў. Думка кіраўніцтва такая: рамонту быць, але свой уклад у інтэрнатны дабрабыт павінны ўнесці і яго жыхары, якіх трэба арганізаваць на суботнікі. Тады яны больш будуць цаніць сваё, няхай і часовае, але ўсё ж жыллё.

Аднак старшыня Магілёўскага аблвыканкама разам з пытаннем Наталлі Макарэвіч імкнуўся вырашыць жыллёвыя праблемы ўсіх магілёўскіх шматдзетных сем'яў, якія не маюць дастаткова камфартабельнага жылля. Сёння ў абласным цэнтры 102 такія сям'і, і яны «раскіданы» па розных жыллёва-будаўнічых кааператывах. Будаўнікі ж зведваюць вядомыя цяжкасці з фінансамі, і ўвод новых дамоў пакуль пад пытальнікам.

— Неабходна сабраць усе шматдзетныя сем'і ў адзін кааператыў, знайсці месца для забудовы ў цэнтры горада, каб з улікам усіх камунікацый квадратны метр быў таннейшым, і ўжо сёлета ўзвесці адзін ці два жылыя дамы, — прыняў Пётр Руднік важнае для людзей рашэнне. — Жыллёва-будаўнічы кааператыў для шматдзетных сем'яў трэба заснаваць у сціслыя тэрміны, да 1 сакавіка.

### РАСКОЛІНЫ І ЦВІЛЬ

Не ўсе тыя магілёўцы, якія ўжо маюць кватэры ў цэнтры горада, адчуваюць сябе шчаслівымі. Жыхары старых дамоў нярэдка ў адчаі патрабуюць ад улад перасялення альбо тэрміновага рамонту. Напрыклад, Наталля Ерафеева, якая мае дваіх дзяцей, жыве ў доме па завулку Пажарным. Гэты дом — гісторыка-культурная каштоўнасць, але ён даўно прызнаны аварыйным. Усіх жыхароў першага паверха пасля таго, як адна жанчына правалілася пад падлогу, выселілі. Іх месца заняла піцэрыя. А на другім паверсе жыхары не толькі пакутуюць ад вечнай вільгаці, але і моцна баяцца шчылін у сценах.

— Што будзе з нашым домам? Наколькі ў ім бяспечна жыць мне і маім дзецям? — пыталася жанчына на прыёме ў Пятра Рудніка.

Меркаванне такое: дом адназначна трэба ставіць на рамонт, а жыхароў адсяляць. Там цяпер жывуць два дзясяткі сем'яў. Аднак найперш трэба брацца за той пад'езд, дзе шчыліны ў сценах, і даць іншае жыллё тром сем'ям, у тым ліку і Наталлі Ерафеевай.

Рамонт помніка архітэктуры, ад якога можа ў выніку застацца толькі адзін фасад, будзе каштаваць, натуральна, нямала грошай. Магілёўскі гарвыканкам спадзяецца знайсці інвестараў. Але пакуль час ідзе, а інвестараў няма. Кіраўнік вобласці запатрабаваў, каб людзей адсялілі ў нармальнае жыллё, і зрабіць гэта трэба на працягу двух тыдняў.

Яшчэ адна жыхарка дома па вуліцы Ленінскай, які быў узведзены аж у 1917 годзе, прыйшла прасіць аб рамонце. З цвіллю і грыбком Святлана Ерафеева змагаецца самастойна, але з дзіркамі ў даху і гнілымі драўлянымі перакрыццямі змагацца яна не ў стане. Апошні раз капрамонт рабілі 40 гадоў таму. Цяпер вырашылі правесці новае абследаванне стану дома і, як мінімум, сёлета зрабіць новы дах.

— Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, мы вырашаем праблему старога жылля, — сказаў Пётр Руднік. — Сёлета будуць адселены каля трох соцень сем'яў. Так атрымліваецца, што ў цэнтры Магілёва ёсць уся сучасная інфраструктура, а вось камфорт у жылых дамах застаўся на ўзроўні пачатку мінулага стагоддзя. Таму трэба на месцы старога жылля будаваць новае і камфартабельнае.

### СЮЖЭТ ДЛЯ ФІЛЬМА

Жыллёвыя праблемы бываюць такімі рознымі, што цяжка паверыць адразу, ці сапраўды рэальныя яны. Напрыклад, адна заяўніца разам з сынам і мужам (з якім у разводзе) жыве ў так званым раёне «Чудзільнікі», дзе да нядаўняга часу людзі жылі без усялякіх выгод. Магілёўскія ўлады адсялялі адтуль жыхароў. І дом, дзе жыве жанчына, ужо забіты дошкамі, але гэтай сям'і не могуць знайсці нармальную кватэру, якая задаволіла б усіх.

Уяўляеце сабе гэты сюжэт для фільма жахаў? Закінуты дом, некалькі жыхароў і... Спатрэбілася ўмяшанне старшыні аблвыканкама, каб сям'і пачалі шукаць 2-пакаёвае жыллё патрэбнага метражу.

Іншая магіляўчанка знаходзіцца яшчэ ў больш незайздросным становішчы: яе прыватны дом прызнаны непрыдатным для пражывання, а будаваць новае жыллё (іншага выйсця пакуль не выпадае) у пенсіянеркі ўжо няма ні здароўя, ні сродкаў. Усе магчымыя варыянты яшчэ раз вывучаць спецыялісты.

У вёсцы Новае Пашкава старыя калгасныя дамы прамярзаюць: нізкая тэмпература паветра не дае нармальна жыць у халодны сезон. Яшчэ адзін прыватны зямельны ўчастак залівае вадой з-за памылак у будаўніцтве дарог. Усім скаржнікам абяцана падтрымка ўлад.

Дарэчы, толькі адзін чалавек прыйшоў 1 лютага на прыём да старшыні Магілёўскага аблвыканкама не з жыллёвымі клопатамі, а з іншымі, грамадска-спартыўнымі. Жыхар Магілёўскага раёна Пётр Марозаў прапаноўвае адрадзіць на вёсцы матабол (!).

Калісьці была такая база, засталіся нават матацыклы, і энтузіяст папрасіў фінансавай дапамогі ў Пятра Рудніка, каб адрадзіць дзіцячую матабольную секцыю. І няхай усе лічаць, што гэта вельмі дарагі від спорту, а дзяцей цяпер нічым не адарваць ад камп'ютарных гульняў, усё ж кіраўнік вобласці вырашыў, што варта паспрабаваць, тым больш што размова ідзе менавіта пра дзіцячы спорт. Таму 300 мільёнаў рублёў у вобласці адшукаюць, а вынікі працы ў справе матабола падвядуць напрыканцы гэтага года.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ПАНЯДЗЕЛАК, 6 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.05, 7.35, 8.10, 8.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05, 16.55 Серыял «Маруся».**
**11.00, 17.45 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».**
**12.10 Камедыя «Мымра».**
**13.40** М/ф.
**14.00** «Мая праўда». Бары Алібасаў».
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Да цешчы на бліны.
**16.30** «Зямля беларуская». «Шчучынскі апокрыф».
**16.40** «Нябачны фронт».
**18.45, 1.30** Зона Х.
**19.35** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.40, 1.45** Дзень спорту.
**21.50** Камандзіроўка.
**22.05 Серыял «Вар'яты».**
**23.05** Клуб рэдактараў.
**0.00 Трылер «Забойствы на рацэ Грын».**

### АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00** (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Права на абарону».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Маст. фільм «Егер».**
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольная закупка».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**17.00** «Вялікая розніца».
**18.20** «Адваротны адлік». «Шанхайскі джаз».
**19.10** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Адкрыты фармат».
**22.05 «Цюдоры». Серыял.**
**23.05** «Закрытыя за мяжой».
**0.05 «След». Серыял.**
**0.40** Начныя навіны.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Гарачы лёд».**
**10.00** Навіны надвор'я.
**10.30** Школа рамонту.
**11.30** Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
**12.35 Камедыя «Ніхто не ведае пра сэкс-2».**
**14.20, 0.20 Серыял «Маргоша».**
**16.10** Пазакласная гадзіна.
**16.30** Нясумны глобус.
**16.55** Пад грыфам «Вядомыя».
**17.25, 22.30 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».**
**18.55** Хакей. КХЛ. «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад) — «Дынама» (Мінск).
**21.00** Калыханка.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часінка.
**23.00** Авертайм.
**23.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Мінщчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.35** «Вялікае снеданне».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная передача».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35** «Гарачы лёд».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50 «Студэнты». Серыял.**
**14.40** «Вялікі горад».
**15.15** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**18.30 «Агонь кахання». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.25 Маст. фільм «Брат 2»**
**23.00** «Тайны свету».
**23.50** «Прафесійны бокс».

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**5.20** «Даведнік».
**6.05** М/с «Апошні з магікан».
**6.40** «Цік-так».
**7.05, 8.05, 2.40 Серыял «Разлучніца».**
**9.05** «Разам».
**10.05 Серыял «Выстрал у спіну».**
**12.20, 22.05** Дак. серыял «І ты, Брут? Сусветная гісторыя здрадніцтваў».
**13.20** М/с «Прыгоды майстра Кун-фу».
**13.40 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.30 Серыял «Дзядуля маёй мары».**
**15.25 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**17.05, 23.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**18.25** «Акцэнты».
**18.40, 2.00** «Саюзнікі».
**19.20** «Усюды жыццё».
**19.50** «Сардэчна запрашаем».
**20.30** «Беларусь сёння».
**21.30, 4.25** «Свет спорту».
**0.05, 1.05 Серыял «Нашы суседзі».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 18.55, 21.00, 23.15** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20, 14.15 Серыял «Бялінда».**
**9.00, 18.00 Серыял «Зачараваныя».**
**9.45 Камедыя «Бар «Гадкі каёт».**
**11.25** «Кінаблакнот».
**11.45 Серыял «Каломба».**
**16.00** «Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Узгорак аднаго дрэва».**
**19.00 Серыял «Кляймо».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Імгла».**

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.10, 23.10, 0.10, 1.10** Прагноз надвор'я.
**6.00, 1.10** «PLAY».
**7.30, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**9.00, 19.00 Серыял «Фізіка або хімія».**
**10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**11.00** «Гэта маё дзіця».
**12.00** «Дэкаратыўныя страсці».
**12.30** «Гарадское падарожжа».
**13.00** «Калекцыя ідэй».
**13.30** «Сябры майго гаспадара».
**14.00** «Спытайце кухара».
**14.30** «Нязоркавае дзяцінства».
**15.00** «Жыццё ў колерах».
**15.30** «Скажы, што не так?!».
**16.30, 0.40** «Гісторыі ў дэталях».
**17.00, 23.10** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**17.30, 23.40** Скетч-шоу «Масгарсмех».
**18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**22.10 Серыял «Метад Лаўровай».**
**0.10 Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**12.25** «Ранішняя@пошта».
**12.55** «Прамы эфір».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.55** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоу.
**16.20 «Кулагін і партнёры».**
**17.30** Весткі. Дзяжурная часць.
**17.55 Серыял «Інстытут высакародных дзяўчат».**
**18.50 Серыял «Ефрасіння. Працяг».**
**20.30 Серыял «Лёсу загадкавае заўтра».**
**21.25 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**23.05 Серыял «Па гарачых слядах».**
**0.05** Сведкі. «Яны былі першымі. Валянцін Зорын». Фільм 1-ы.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «НТБ раніцай».
**8.35 Серыял «Марскія д'ябля».**
**9.35, 15.35, 18.40, 22.45** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.10** «Да суда».
**12.05** Суд прысяжных.
**13.25 Серыял «Сужэнцы».**
**15.10** «Справа густу».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.25** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**19.30 Серыял «ППС».**
**21.05 Серыял «Кодэкс гонару-5».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.25** «Сумленны панядзелак».
**0.10 Серыял «Маладыя і злыя».**

### ІНТЭР+

**8.00, 9.00, 9.30, 10.00, 13.00** Навіны.
**8.10, 8.35, 9.10, 9.35** З новай раніцай.
**8.30, 21.25, 4.25** Спорт у Падрабязнасцях.
**10.10, 14.30, 1.20** Дак. серыял «Прыхільнікі перамен».
**10.35, 14.55, 1.45** Дак. серыял «Галівудскія пары».
**11.25** Дак. фільм «Адданыя помсты».
**12.15, 21.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**13.15** Знак якасці.
**13.45, 20.15, 3.15 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**15.45, 2.35** Судовыя справы.
**16.25** Агенты ўплыву.
**17.00, 0.10, 5.15 Серыял «Таямнічы востраў». 1, 2-я серыі.**
**17.50, 6.05** Дак. фільм «Адваротны бок Месяца».
**18.40** Дак. серыял «Лаўрэаты кінаакадэміі Оскар». 1-я серыя.
**19.30** Дак. серыял «Вароты часу». 1-я серыя.
**21.00, 4.00** «Падрабязнасці».
**22.15, 4.30 Серыял «Крывінка». 1-я серыя.**
**23.00, 6.50 Серыял «Сваты-1». 1-я серыя.**
**1.00** Феерыя падарожжаў.

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00** «Наглядальнік».
**10.05 «Халодны дом». Маст. фільм.**
**11.00, 23.45** «Песні па дарозе скрозь час. Венскі хор хлопчыкаў». Дак. фільм.
**11.55** «Лінія жыцця». Леў Прыгуноў.
**12.45** «Гісторыя твораў мастацтва». Дак. серыял.
**13.15** З залатой калекцыі тэлетэатра. Г. Запольская. «Мараль пані Дульскай». Тэлеспектакль. Запіс 1978 года. Частка 1-я.
**14.40, 18.30, 22.45** Навіны культуры.
**14.50** «Орсан і Алівія». М/с.
**15.15** «Дзядзька Міша». М/ф.
**15.25 «Загадкавыя гісторыі Энід Блайтан». Серыял.**
**15.50, 0.40** «Малпы-зладзюжкі». Дак. серыял.
**16.15, 1.25** «Гвардзейскі корпус». Дак. фільм.
**16.45** «Вялікія інструментальныя канцэрты Бетховена».
**17.35** Прыступкі цывілізацыі. «Тайны мінулага». Дак. серыял.
**18.45** Галоўная роля.
**19.05** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.45** «Паліглот».
**20.30** «Двайны партрэт у інтэр'еры эпохі. Зошчанка і Алеша». Дак. фільм.
**21.30** «Тым часам».
**22.15** «Заўтра не пamрэ ніколі». Дак. фільм.
**23.05** «90-я: Чорная дзірка, або Крок у будучыню?».
**1.10** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Да і пасля паўночы».
**6.15** «Вакол смеху». 1981 год.
**7.40** «Бенефіс» прадстаўляе... Людміла Гурчанка». 1978 год.
**9.00 «Цыклон» пачнецца ўначы». Маст. фільм.**
**10.15** «Мелодыі сяброў». Канцэрт. 1968 год.
**11.00** «Паштовае аддзяленне «Блакітнага агеньчыка». 1966 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.10** «Чарадзейны ліхтар». Спектакль.
**14.00** «Увага, тыгры!». Дак. фільм.
**14.30** «Чатыры клоўны пад адным дахам». Фільм-канцэрт.
**15.30** «Вечар паэзіі».
**17.00** «Па законе інерцыі». Спектакль.
**18.00** «Закаханым аб закаханых». Канцэрт.
**18.40** «Чалавек збоку». Спектакль, частка 1-я.
**19.45** «Маленькі канцэрт».
**20.00** «Для тых, хто любіць і памятае». 1990 год.
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Рытмы Апшэрона». Фільм-канцэрт.
**23.05** «И осталось, как всегда, недосказанное что-то...». Дак. фільм.
**0.05** «Спявае ансамбль «Здравствуй, песня!». Фільм-канцэрт.
**0.40 «Дванаццаць крэслаў». Маст. фільм.**
**2.00** «Рок супраць тэрору». Канцэрт.
**4.00** «Кінапанарама». 1981 год.

### MTV

**5.00, 2.20** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.30** American Idol-2011.
**10.30, 1.00** Трэндзі.
**11.00** News блок Weekly.
**11.30** Топ Мадэль.
**12.25, 17.00, 21.00** «Канікулы ў Мексіцы».
**13.25** Спатканне з мамуляй.
**13.50, 18.00** Кахаць або забіць?
**14.15, 20.10** Халасцячка.
**15.10** Цяжкасці кахання.
**16.00** «Вольны».
**16.30** Кэш&Трэш.
**18.20 «Гімнасткі». Серыял.**
**19.10 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
**22.00 «Сябры». Серыял.**
**22.30 «Як я сустрэў вашу маму». Серыял.**
**23.00** News блок.
**23.30** Х-Фактар.
**1.30** Біся і спявай.

### 20.25 ФІЛЬМ ДНЯ

**«БРАТ 2»** (РАСІЯ, 2000 г.)

Даніла Багроў прыехаў у Маскву, каб сустрэцца з армейскімі сябрамі Ільёй і Косцем. Косця Громаў расказаў Данілу пра свайго брата-блізнюка, якога ў Чыкага мафіёзі Меніс абдурыў амаль на мільён долараў. Раніцай Даніла наведаў Косцю і знайшоў сябра забітым. Даніла і яго старэйшы брат Віктар адправіліся ў ЗША, каб адпомсціць за Косцю.



**Рэжысёр** — Аляксей Балабанаў. **У ролях:** Сяргей Бадроў-мал., Сяргей Макавецкі, Віктар Сухарукаў, Ірына Салтыкова.

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Драма «Я вольны, я нічый».
**7.55** Трагікамедыя «Други игрищ и забав».
**8.30, 14.30** Прыгоды «Здабытак рэспублікі»
**10.45, 16.45** Дэтэктыў «Ідэальнае злачынства».
**14.00** Плюс кіно.
**18.30, 0.30** Драма «Мой баявы разлік».
**20.30, 2.30** Трагіфарс «Вынас цела».
**22.30, 4.30** Трагікамедыя «Дробны нячысцік».

### ДОМ КІНО

**3.00, 19.10** Серыял «Таццянін дзень».
**3.45** Новы хіт. Трылер «Чызкейк».
**5.15** Прыгодніцкі фільм «Без трох хвілін роўна».
**6.25** Трагікамедыя «Крыўда».
**7.50** Вострасюжэтны фільм «На гранатавых астравах».
**9.25** Камедыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
**11.00, 12.50, 19.05, 20.50, 2.55** «Акно ў кіно».
**11.05, 20.00** Серыял «Новы рускі раманс».
**12.00** Шматсерыйны фільм «Цені знікаюць апоўдні».
**12.55** Кінараман «Ад зарплаты да зарплаты».
**14.20** Новы хіт. Меладрама «Першая спроба».
**17.30** Камедыя «Паліцэйскія і зладзеі».
**20.55** Новы хіт. Ваенная драма «Вышыня 89».
**22.50** Музычная камедыя «Каралі і капуста».
**1.20** Кінараман «Васіль і Васіліса».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Маст. фільм «Што з табой адбываецца?».
**6.10, 10.10, 14.10** М/с «Па слядах брэменскіх музыкантаў». М/ф «Шэры воўк энд Чырвоны каптурок».
**7.00, 11.00** Казкі народаў свету. «Лапландскія казкі».
**8.15, 12.15** Рускія народныя казкі. «Васіліса Мікулішна». М/ф: «Маленькі Шэга», «Старая цацка».
**15.00** Маст. фільм «Дай лапу, сябар!».
**16.05** М/с «Наш сябар Пішычытай». М/ф: «Прыязджайце ў госці», «Фядорына гара», «Салодкая крыніца», «Карусельны леў».
**17.00** М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі: «Вялікі падземны баль», «Малпа з вострава Саругасіма».
**18.00** «Урокі цётачкі Савы». М/ф: «Грыбок-цярамок», «Піражок».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Мент у законе-4».
**20.00, 2.00** Серыял «Тайны следства-9».
**21.00, 3.00** Серыял «Дарожны патруль».
**22.00** Серыял «Строгавы».
**23.30** Серыял «Соль зямлі». 1-я серыя.

### ТБ3

**5.00, 4.30** М/ф.
**6.00** «Незвычайныя жывёлы».
**6.30** «Дзецям пра зверанят».
**7.00** Серыял «Зена — каралева воінаў».
**8.00, 15.15** Дак. фільм «Рэальнасць або фантастыка?».
**9.00** «Як гэта зроблена».
**9.30** Дак. фільм «Паддоследны трус».
**10.00** Дак. фільм «Двайное жыццё».
**11.00** Дак. фільм «Гарадскія легенды».
**11.30** Дак. фільм «Гэта фантастычнае свята».
**12.25** Маст. фільм «Апантанасць».
**14.20, 1.30** Серыял «Прытворшчык».
**16.15** Дак. фільм «Вялікі падман».
**17.10** Серыял «Уздзеянне».
**18.05** Серыял «Менталіст».
**19.00** Серыял «Мяжа».
**20.00** Дак. фільм «Загадкі гісторыі».
**21.00** Маст. фільм «Каралева праклятых».
**22.45** Серыял «Медыум».
**23.45** Маст. фільм «Адысей і востраў туманаў».
**2.30** Дак. фільм «Уладары».
**3.30** Серыял «Быць Эрыкай».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Камедыя «Кантракт на каханне».
**10.45, 18.45, 2.45** Драма «Прывітанне, ноч».
**12.35, 20.35, 4.35** Драма «Прарок».
**15.15, 23.15, 7.15** Камедыя «Элі Паркер».

### ТБ1000

**3.00, 20.50** Драма «Водгулле мінулага».
**5.00** Драма «Яркая зорка».
**7.20** Камедыя «Тэорыя хаосу».
**9.00** Камедыя «Аўтсайдары».
**11.00** Камедыя «Трое ў каноэ».
**13.00** Драма «Салодкая поўнач».
**15.00** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць».
**17.00** Камедыя «Каханне і іншыя непрыемнасці».
**19.00** Драма «Сарціроўка».
**22.45** Трылер «Матрыца: Перазагрузка».
**1.20** Камедыя «Шосты элемент».

### ІЛЮЗІЁН

**0.45** Амерыканскае злачынства.
**2.15** Наркоз.
**3.55** Сны пра рыбу.
**5.50** Здохні!
**7.25** Троцкі.
**9.45** Пахаваны жывым.
**11.45, 23.25** Апаганшчыкі магіл.
**13.50** Шоу Джымі.
**15.35** Непрыдуманая гісторыя Лены Бэкер.
**17.25** Пятая запаведзь.
**19.30** Без цэнзуры.
**21.00** Мемуары гейшы.

### DIVA UNIVERSAL

**5.00** Трылер «У звязцы».
**6.30, 0.40, 4.00** «Быць Эрыкай».
**7.20, 12.50, 17.40** «Горад прышэльцаў».
**8.10, 12.00, 19.10** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні акругі Орындж».
**9.00** Драма «Не помнячы сябе».
**10.30** Драма «Танцы падчас Луназы».
**13.40, 18.25** «Шпік».
**14.30** Маст. фільм «Дабіся поспеху зноў!».
**16.00** Драма «Патрыцыя Корнуэл: фактар рызыкі».
**20.00** Цяжарнасць на абцасах.
**20.45** «Нявеста для мільянера».
**21.30** Маст. фільм «Ідэал».
**23.00, 3.00** «Джордан расследуе».
**1.30** Драма «Злачынствы моды: забойная стрыжка».

### РАМАНТЫКА

**8.00, 22.20, 6.20** «Стол на траіх».
**8.55, 11.40, 21.30** «Кругасветнае падарожжа».
**9.50, 15.10, 17.55, 1.55** «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
**10.45, 16.05, 4.35** «Пражыць жыццё».
**12.30, 18.45, 3.40** «Паслухай, красуня».
**13.25, 2.50, 7.10** «Ніколі не позна?».
**14.20, 0.05, 5.30** «Парадоксы кахання».
**17.00, 20.35, 23.10** «Дасканалая прыгажосць».
**1.00** «Такое жыццё».

### AXN-SciFi

**0.00, 6.35, 9.05, 12.50** На краі Сусвету.
**5.00, 10.45** Знешнія межы.
**5.45, 11.35** Зорная брама.
**9.00, 15.55** Змярканне ў Вальмонце.
**10.00** Каралеўскі шпіталь.
**12.20** Сышчык смерці.
**13.40, 17.30** Мерлін.
**14.30, 21.30** Чорная лагуна.
**16.00, 20.00** XIII.
**18.15, 23.00** Гарады падзямелля.
**19.10, 23.40** Застаца ў жывых.

### EUROSPORT

**10.30, 17.00, 18.00** Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.
**13.00** Снукер. German Masters. Фінал.
**14.30, 22.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**15.30, 3.00** Біятлон. Кубак свету.
**19.30, 2.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.30, 1.15** Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
**22.45** Вось гэта дзіва!!!
**23.00** Пра рэстлінг.
**0.45** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 13.00, 17.00** Цуды інжынерыі.
**6.00** Баброва плаціна.
**7.00** Уздоўж Вялікай кітайскай сцяны.
**8.00, 12.00** Загадкі гісторыі.
**9.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**10.00, 16.00, 20.00, 23.00, 2.00** Ліхтугі за мяжой.
**11.00, 19.00, 4.00** Мегазаводы.
**14.00** Горад мурашак.
**15.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**18.00, 1.00** Ідэальная зброя.
**21.00, 0.00, 3.00** Турэмныя наглядчыцы.
**22.00** Забароны.

### DISCOVERY

**7.00, 16.35** Махінатары.
**7.25, 12.00, 2.55** Гіганцкія будоўлі.
**8.20, 19.00, 5.10** Як гэта ўстроена?
**8.50, 19.30, 5.40** «Як гэта зроблена?».
**9.15, 0.00** Крутыя выбухі.
**10.10, 18.00, 3.50** Разбуральнікі легенд.
**11.05, 15.40, 6.05** Круты цюнінг.
**12.55** «Пэн і Тэлер, праўда і хлусня».
**13.50** Скрыўленне часу.
**14.45, 20.00, 1.00** «Top Gear».
**17.05** Першая дзясятка.
**21.00, 2.00** «Залатая ліхаманка».
**22.00** «Вугаль».
**23.00** Рыба-меч: жыццё на кручку.
**4.45** Маланкавыя катастрофы.

### ЗДАРОЎЕ

**5.10** Метэазалежнасць.
**5.40, 20.40, 3.50** Энцыклапедыя памылак.
**5.55, 20.55** Алкаголь, тытунь, наркотыкі.
**6.35, 21.35** Як Вы сябе адчуваеце?
**7.15, 22.15** Дыялогі пра харчаванне.
**8.00, 23.00** Выдаткі вытворчасці.
**8.40, 12.50, 23.40, 4.05** Гэта карысна ведаць!
**9.50, 0.50** Што мы носім?
**10.30, 1.30** Колькі вам гадоў?
**11.00** Я чакаю дзіця.
**11.40, 2.40** Вялікая прабежка.
**12.10, 3.10** Кабінет прыгажосці.
**14.00** Мужчынскія сакрэты.
**14.40, 17.40** Дзіця нарадзілася.
**15.20** Дзіцячая медыцына.
**15.50** Найноўшыя дасягненні.
**16.30** Я перамог гэты боль.
**17.00** Шлях да здароўя.
**18.20** Я расту.
**18.50** Пра дыеты і не толькі.
**19.30** Панацэя.
**20.10** Элемент здароўя.
**2.00** Выкрыццё прадуктаў.

### TRAVEL

**8.00, 13.00, 15.00, 17.00, 20.00, 0.00, 5.00** Сусветны падарожнік.
**9.00** Планета спорту.
**10.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**11.00, 1.00, 6.00** Планета ежы.
**12.00, 18.30, 7.00** Хутка адкрыццё.
**12.30, 18.00, 7.30** Дзікія сэрцам.
**14.00, 19.00** Сафі Грыгсан на ўсходнім базары.
**14.30, 19.30** Шэф-кухар за мяжой.
**16.00** The Ethical Hedonist.
**21.00, 23.30, 2.00, 4.30** Пра галоўнае.
**21.30, 2.30** Падарожжа сёння.
**22.00, 3.00** Мараплаўцы.
**23.00, 4.00** Падарожжа на поўдзень.
**7.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.

### ANIMAL PLANET

**7.00** «Малпіна жыццё».
**7.25** Як стаць...
**8.15, 16.00** «Самае дзікае шоу».
**8.40** Усё пра сабак.
**9.10** Конкурс на званне самага выродлівага сабакі.
**10.05, 17.25, 22.00, 2.35** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**11.00** «Заатур Мікаэлы».
**11.55** Шатландскае таварыства абароны жывёл.
**12.20, 19.40** «SOS дзікай прыроды».
**12.50, 6.10** «Тэрыторыя жывёл».
**13.45** Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
**14.40, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**15.30** «Рэха і сланы Амбазелі».
**16.30** «Заасад Крыса Хамфры».
**17.00** «Пагаворым з жывёламі».
**18.20** «Котак не любіць нельга».
**19.15** Школа гарыл.
**21.05, 4.25** «Незвычайныя вынаходствы для жывёл».
**22.55, 3.30** «Карына: дзікае сафары».
**23.50** Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
**0.45** Дзікія і небяспечныя.
**1.40** Справа аб акулавым нападзе.
**5.20** Рай для шымпанзэ.
**5.45** «Будні дэльфінаў».

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00, 23.45** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.00** Нашы дзеці.
**14.00, 1.00** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

## АЎТОРАК, 7 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.05, 7.35, 8.10, 8.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**9.10, 19.55 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».**
**10.05, 16.55 Серыял «Маруся».**
**11.00, 17.45 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».**
**12.10** Арэна.
**12.35** «Еўрафэст». Відэадзённік.
**12.45, 22.05 Серыял «Вар'яты».**
**13.45** М/ф.
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоу.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Камандзіроўка.
**15.40** Каробка перадач.
**16.10** Эпоха. Падзеі і людзі.
**18.45, 1.05** Зона Х.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40, 1.15** Дзень спорту.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.20 Драма «Хардбол».**

### АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00** (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.05** «Права на абарону».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 «Бедная Насця». Серыял.**
**12.00** «Ігар Матвіенка. Маэстра ў джынсах».
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольная закупка».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**17.00** «Давай пажэнімся!».
**18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.**
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 «Жукаў». Серыял.**
**22.10 «Цюдоры». Серыял.**
**23.10** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.40** «Адваротны адлік». «Шанхайскі джаз».
**0.10 «След». Серыял.**
**0.45** Начныя навіны.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Гарачы лёд».**
**9.55** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**10.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**11.40** Авертайм.
**12.10** Кінапробы.
**12.45 Дэтэктыў «Адваротны бок».**
**14.20, 23.40 Серыял «Маргоша».**
**16.10** Пазакласная гадзіна.
**16.30** Нясумны глобус.
**16.55** Цела чалавека.
**17.25, 22.30 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».**
**18.55 Драма «Буш».**
**21.05** Калыханка.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часінка.
**23.00** Спорт-кадр.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Мінщчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Брат 2».**
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35, 18.30 «Агонь кахання». Серыял.**
**13.50 «Студэнты». Серыял.**
**14.40 Драма «Гульня слоў».**
**16.50 «Следакі». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.25 «Знахар». Серыял.**
**21.25 «Доктар Тырса». Серыял.**
**23.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя». «Како Шанэль — імператрыца моды».
**23.35** «Аўтапанарама».
**0.00 «NEXT-2». Серыял.**
**0.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05, 20.45** «Простая мова».
**5.20** Дак. серыял «Дом з гісторыяй».
**6.05** М/с «Апошні з магікан».
**6.40** «Цік-так».
**7.05, 8.05, 3.30 Серыял «Разлучніца».**
**9.05** «Агульны рынак».
**9.25** «Агульны інтарэс».
**10.05 Маст. фільм «Развітальная гастроль «Артыста».**
**12.20, 22.05** Дак. серыял «І ты, Брут? Сусветная гісторыя здрадніцтваў».
**13.20** М/с «Прыгоды майстра Кун-фу».
**13.40 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.30 Серыял «Дзядуля маёй мары».**
**15.25 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**17.05, 23.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**18.25** «Акцэнты».
**18.40 Серыял «Аляксандраўскі сад».**
**21.25, 4.25** «Дыяспары».
**0.05, 1.05 Серыял «Нашы суседзі».**
**2.00** «Усюды жыццё».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.10, 14.15, 18.55, 21.00, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 14.20 Серыял «Бялінда».**
**8.50** «Кінаблакнот».
**9.10, 18.00 Серыял «Зачараваныя».**
**10.00, 16.00** «Мультпарад».
**10.30, 19.00 Серыял «Кляймо».**
**12.15 Трылер «Імгла».**
**16.20** Спявае Аляксандр Саладуха.
**17.00 Серыял «Узгорак аднаго дрэва».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Драйв».**
**22.55** «Бульбокс».

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.10, 23.10, 0.10, 1.10** Прагноз надвор'я.
**6.00, 1.10** «PLAY».
**7.30, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**9.00, 19.00 Серыял «Фізіка або хімія».**
**10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**11.00, 22.10 Серыял «Метад Лаўровай».**
**12.00** «Гарадское падарожжа».
**13.00** «Калекцыя ідэй».
**13.30** «Сябры майго гаспадара».
**14.00** «Спытайце кухара».
**14.30** «Нязоркавае дзяцінства».
**15.00** «Жыццё ў колерах».
**15.30** «Скажы, што не так?!».
**16.30, 0.40** «Гісторыі ў дэталях».
**17.00, 23.10** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**17.30, 23.40** Скетч-шоу «Масгарсмех».
**18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.10 Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.10 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 16.20 «Кулагін і партнёры».**
**12.00, 23.05 Серыял «Па гарачых слядах».**
**12.55** «Прамы эфір».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.55** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоу.
**17.30** Весткі. Дзяжурная часць.
**17.55 Серыял «Інстытут высакародных дзяўчат».**
**18.50 Серыял «Ефрасіння. Працяг».**
**20.30 Серыял «Лёсу загадкавае заўтра».**
**21.25 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**0.05** Сведкі. «Яны былі першымі. Валянцін Зорын».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «НТБ раніцай».
**8.35 Серыял «Марскія д'яблы».**
**9.35, 15.35, 18.40, 22.45** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суда».
**12.05** Суд прысяжных.
**13.25 Серыял «Сужэнцы».**
**15.10** «Справа густу».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.25** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**18.10** «Увага, вышук!».
**19.30 Серыял «ППС».**
**21.05 Серыял «Кодэкс гонару-5».**
**22.45** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.25 Серыял «Маладыя і злыя».**

### ІНТЭР+

**8.00, 9.00, 9.30, 10.00, 13.00** Навіны.
**8.10, 8.35, 9.10, 9.35** З новай раніцай.
**8.30, 21.25, 4.25** Спорт у Падрабязнасцях.
**10.10, 14.30, 1.20** Дак. серыял «Прыхільнікі перамен».
**10.35, 14.55, 1.45** Дак. серыял «Галівудскія пары».
**11.25, 17.50, 6.00 Серыял «Кліч продкаў».**
**12.15, 21.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**13.15** Знак якасці.
**13.45, 20.15, 3.15 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**15.45, 2.35** Судовыя справы.
**16.25, 0.55** Легенды бандыцкай Адэсы.
**16.45** Купаж.
**17.00, 0.10, 5.15 Серыял «Таямнічы востраў».**
**18.40** Дак. серыял «Лаўрэаты кінаакадэміі Оскар».
**19.30** Дак. серыял «Вароты часу».
**21.00, 4.00** «Падрабязнасці».
**22.15, 4.30 Серыял «Крывінка».**
**23.00, 6.50 Серыял «Сваты-1».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** «Наглядальнік».
**10.05 «Халодны дом». Маст. фільм.**
**11.00, 19.45** «Паліглот».
**11.45, 17.35** «Тайны мінулага». Дак. серыял.
**12.40** «Мой Эрмітаж».
**13.10** «Дантэ Аліг'еры». Дак. фільм.
**13.15** З залатой калекцыі тэлетэатра. Г. Запольская. «Мараль пані Дульскай». Тэлеспектакль. Запіс 1978 года. Частка 2-я.
**14.40, 18.30, 22.45** Навіны культуры.
**14.50** «Орсан і Алівія». М/с.
**15.15** «Певень і баярын». М/ф.
**15.25 «Загадкавыя гісторыі Энід Блайтан». Серыял.**
**15.50, 0.55** «Малпы-зладзюжкі». Дак. серыял.
**16.15, 1.25** «Гвардзейскі корпус». Дак. фільм.
**16.45** «Вялікія інструментальныя канцэрты Бетховена».
**18.45** Галоўная роля.
**19.05** Улада факта. «Калі памруць газеты?».
**20.30** «Двайны партрэт у інтэр'еры эпохі. Эйзенштэйн і Меерхольд». Дак. фільм.
**21.30** «Гульня ў бісер». Ток-шоу.
**22.15** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. фільм.
**23.10 Да 110-годдзя з дня нараджэння Любові Арловай. «Вясёлая моладзь». Маст. фільм.**
**0.40** Р. Шчадрын. Сюіта з оперы «Не толькі каханне».
**1.50** «Дантэ Аліг'еры». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Паштовае аддзяленне «Блакітнага агеньчыка». 1966 год.
**6.00, 15.00, 21.00** «Народжаныя ў СССР».
**7.10** «Чарадзейны ліхтар». Спектакль.
**8.00** «Увага, тыгры!». Дак. фільм.
**8.30** «Чатыры клоўны пад адным дахам». Фільм-канцэрт.
**9.30** «Вечар паэзіі».
**11.00** «Па законе інерцыі». Спектакль.
**12.00** «Закаханым аб закаханых». Канцэрт.
**12.40, 18.40** «Чалавек збоку». Спектакль.
**13.45** «Маленькі канцэрт».
**14.00** «Для тых, хто любіць і памятае». 1990 год.
**16.00** «Рытмы Апшэрона». Фільм-канцэрт.
**17.05** «Яловая субмарына».
**18.05** «І жартам, і сур'ёзна». 1987 год.
**19.30** «Спявае Валянціна Талкунова». Фільм-канцэрт.
**20.00** Сустрэча ў «Астанкіна» з Андрэем Міронавым. 1978 год.
**22.00** «На канцэрце Хуліа Іглесіяса».
**23.05** «Да і пасля паўночы».
**0.20** «Вакол смеху». 1981 год.
**1.40** «Бенефіс» прадстаўляе... Людміла Гурчанка». 1978 год.
**3.00 «Цыклон» пачнецца ўначы». Маст. фільм.**
**4.15** «Мелодыі сяброў». Канцэрт.

### MTV

**5.00, 2.20** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.40, 23.30** Х-Фактар.
**10.00** Big Love Chart.
**11.00, 23.00** News блок.
**11.30** Топ Мадэль.
**12.25, 17.00, 21.00** "Канікулы ў Мексіцы».
**13.25** Спатканне з мамуляй.
**13.50, 18.00** Кахаць або забіць?
**14.15, 20.10** Халасцячка.
**15.10** Цяжкасці кахання.
**16.00** «Вольны».
**16.30** Кэш&Трэш.
**18.20 «Гімнасткі». Серыял.**
**19.10 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
**22.00 «Сябры». Серыял.**
**22.30 «Як я сустрэў вашу маму». Серыял.**
**0.30** Бісяі спявай.
**1.20** Руская дзясятка.

### 23.20 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ХАРДБОЛ»** (ГЕРМАНІЯ, ЗША, 2001 г.)

Конар О'Ніл — дробны жулік і спекулянт. Апошнім часам удача ўсё часцей здраджвае яму, а крэдыторы настойліва патрабуюць вяртання даўгоў, пагражаючы расправай. Стары прыяцель гатовы выручыць яго грашыма, але пры адной умове: О'Ніл павінен узяцца за трэніроўкі дзіцячай бейсбольнай каманды — самай горшай у Чыкага.



**Рэжысёр** — Браян Робінс. **У ролях:** Кеану Рыўз, Даяна Лейн, Джуліян Грыфіт.

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Драма «Мой баявы разлік».
**8.30, 14.30** Трагіфарс «Вынас цела».
**10.30, 16.30** Трагікамедыя «Дробны нячысцік».
**18.30, 0.30** Маст. фільм «Жыццё Аляксандра Неўскага».
**20.00** Плюс кіно.
**20.30, 2.30** Драма «Памылка інжынера Кочына».
**22.30, 4.30** Камедыя «Авантура».
**23.55, 5.55** Трагікамедыя «Празрыстае сонца восені».
**1.55** Кінанавела «Ванька».

### ДОМ КІНО

**3.00, 19.10** Серыял «Таццянін дзень».
**3.45, 11.05** Серыял «Новы рускі раманс». Заключная серыя.
**4.40** Іранічны дэтэктыў. «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант: Гадзюка ў сіропе». 1-я серыя.
**5.35, 11.00, 12.50, 19.05, 20.50, 2.55** «Акно ў кіно».
**5.40** Новы хіт. Ваенная драма «Вышыня 89».
**7.25** Музычная камедыя «Свінарка і пастух».
**8.50** Кінараман «Асабістыя інтарэс».
**12.00** Шматсерыйны фільм «Цені знікаюць апоўдні».
**12.55** Фільм-прытча «Карабель».
**15.15** Новы хіт. Крымінальны баявік «Выхад».
**16.50** Музычная камедыя «Набожная Марта».
**20.00** Серыял «Афіцэры». 1-я серыя.
**20.55** Камедыя «Гульня».
**22.30** Лідар кінапракату. «Табар ідзе ў неба».
**0.10** Прыгодніцкі фільм «...І зноў май!».
**1.20** Фестывальнае кіно. «Наследніца па прамой».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Маст. фільм «Дай лапу, сябар!».
**6.05, 10.05, 14.05** М/с «Наш сябар Пішычытай». М/ф: «Прыязджайце ў госці», «Фядорына гора», «Салодкая крыніца», «Карусельны леў».
**7.00, 11.00** М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі: «Вялікі падземны баль», «Малпа з вострава Саругасіма».
**8.00, 12.00** «Урокі цётачкі Савы». М/ф: «Грыбок-цярамок», «Піражок», «Вясёлая карусель» № 2».
**15.00** Прыгоды «Фрак для шалапута».
**16.10** М/с «Наш сябар Пішычытай». М/ф: «Нябачаная, нечуваная», «Два білеты ў Індыю», «Вясёлая карусель» № 22».
**17.00** М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі Андэрсэна. «Дзюймовачка».
**18.00** «Урокі цётачкі Савы». М/ф: «Вагончык», «Пазалочаныя лбы».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Мент у законе-4».
**20.00, 2.00** Серыял «Тайны следства-9».
**21.00, 3.00** Серыял «Дарожны патруль».
**22.00, 23.30** Серыял «Соль зямлі».

### ТБ3

**5.00, 4.30** М/ф.
**6.30** «Дзецям пра зверанят».
**7.00** Серыял «Зена — каралева воінаў».
**8.00, 15.15** Дак. фільм «Рэальнасць або фантастыка?».
**9.00** «Як гэта зроблена».
**9.30** Дак. фільм «Паддоследны трус».
**10.00** Дак. фільм «Вялікі падман».
**11.00** Дак. фільм «Гарадскія легенды».
**11.30, 20.00** Дак. фільм «Загадкі гісторыі».
**12.25, 18.05** Серыял «Менталіст».
**13.20, 19.00** Серыял «Мяжа».
**14.20, 1.30** Серыял «Прытворшчык».
**16.15** Дак. фільм «Згубны бляск. Брыльянт Сансі».
**17.10** Серыял «Уздзеянне».
**21.00** Маст. фільм «Балотная акула».
**22.45** Серыял «Медыум».
**23.45** Маст. фільм «Каралева праклятых».
**2.30** Дак. фільм «Прадчуванне смерці. Васіль Шукшын».
**3.30** Серыял «Быць Эрыкай».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Сны пра Расію».
**11.10, 19.10, 3.10** Драма «Пагарда».
**13.00, 21.00, 5.00** Трылер «На разрыў».
**14.35, 22.35, 6.35** Драма «Якая танцуе ў цемры».

### ТБ1000

**3.00, 20.50** Трылер «Адвакат д'ябла».
**5.30** Драма «Сарціроўка».
**7.20** Драма «Салодкая поўнач».
**9.00** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць».
**11.00** Камедыя «Каханне і іншыя непрыемнасці».
**13.00** Камедыя «Узорны самец».
**15.00** Драма «Вераніка вырашае памерці».
**17.00** Драма «Крык савы».
**19.00** Камедыя «Стэпфардскія жонкі».
**23.30** Камедыя «Шосты элемент».
**1.20** Драма «Смерць у эфіры».

### ІЛЮЗІЁН

**1.05** Шоу Джымі.
**3.00** Непрыдуманая гісторыя Лены Бэкер.
**4.45** Мемуары гейшы.
**7.10** Без цэнзуры.
**8.40** Амерыканскае злачынства.
**10.30** Наркоз.
**12.20, 23.00** Сны пра рыбу.
**14.15** Троцкі.
**16.10** Здохні!
**17.45** Ежа і жанчына на скорую руку.
**19.30** Карсіканец.
**21.15** Пахаваны жывым.

### DIVA UNIVERSAL

**5.00** Драма «Не помнячы сябе».
**6.30, 23.00, 0.40, 4.00** «Быць Эрыкай».
**7.20, 12.50, 17.40** «Горад прышэльцаў».
**8.10, 12.00, 19.10** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні акругі Орындж».
**9.00** Драма «Размова з прывідам».
**10.35** Камедыя «Раман па перапісцы».
**13.40, 18.25** «Шпік».
**14.20** Камедыя «Мяне завуць Рыд Фіш».
**16.00** Цяжарнасць на абцасах.
**16.50** Нявеста для мільянера.
**20.00** Драма «Патрыцыя Корнуэл: цень з мінулага».
**21.30** «Пляткарка».
**22.15** «Пасрэднік Кейт».
**23.50, 3.00** «Джордан расследуе».
**1.30** Маст. фільм «Дагавор на цяжарнасць».

### РАМАНТЫКА

**8.00, 22.20, 6.20** «Стол на траіх».
**8.55, 11.40, 21.30** «Кругасветнае падарожжа».
**9.50, 15.10, 17.55, 1.55** «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
**10.45, 16.05, 4.35** «Пражыць жыццё».
**12.30, 18.45, 3.40** «Паслухай, красуня».
**13.25, 2.50, 7.10** «Ніколі не позна?».
**14.20, 0.05, 5.30** «Парадоксы кахання».
**17.00, 20.35, 23.10** «Дасканалая прыгажосць».
**1.00** «Такое жыццё».

### AXN-SciFi

**0.20, 6.30, 13.45, 17.40** Мерлін.
**1.05, 5.45, 11.50** Зорная брама.
**1.50, 5.00, 11.05** Знешнія межы.
**2.35, 8.50, 19.15, 23.35** Застаца ў жывых.
**3.20, 13.00, 18.30, 22.45** Гарады падзямелля.
**4.05, 12.40** Сышчык смерці.
**7.15, 14.35, 21.30** Чорная лагуна.
**8.35, 15.55** Змярканне ў Вальмонце.
**9.35, 16.00** XIII.
**20.00** Візіцёры.

### EUROSPORT

**10.30** Футбол. Еўрагалы.
**11.30** Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.
**14.00, 20.45** Вось гэта дзіва!!!
**15.00, 2.30** Тэніс. Турнір WTA.
**21.00, 1.30** Снукер. German Masters. Фінал.
**22.30** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна».
**23.00** Бокс.
**1.00** Ралі. Серыя IRC.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 17.00, 20.00, 23.00, 2.00** Цуды інжынерыі.
**6.00** Монстр ракі Конга.
**7.00, 10.00, 12.00, 16.00** Ліхтугі за мяжой.
**8.00** Турэмныя наглядчыцы.
**9.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**11.00, 19.00, 4.00** Мегазаводы.
**13.00** Турэмныя наглядчыцы.
**14.00** Звяры-тытаны.
**15.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**18.00, 1.00** Ідэальная зброя.
**21.00, 0.00, 3.00** Шалёныя вынаходнікі.
**22.00** Забароны.

### DISCOVERY

**7.00, 16.35** Махінатары.
**7.25, 12.00, 21.00, 2.00, 2.55** Гіганцкія будоўлі.
**8.20, 19.00, 5.10** Як гэта ўстроена?
**8.50, 19.30, 5.40** «Як гэта зроблена?».
**9.15, 0.00** Крутыя выбухі.
**10.10, 18.00, 3.50** Разбуральнікі легенд.
**11.05, 15.40, 6.05** «Круты цюнінг».
**12.55** «Залатая ліхаманка».
**13.50** «Вугаль».
**14.45, 20.00, 1.00** «Top Gear».
**17.05** Першая дзясятка.
**22.00** «Грандыёзныя пераезды».
**23.00** «У разрэзе».
**4.45** «Маланкавыя катастрофы».

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Рэцэпты на розных мовах.
**5.40, 14.40, 20.40** Дзіця нарадзілася.
**6.20, 21.20** Дзіцячая медыцына.
**6.50, 21.50** Найноўшыя дасягненні.
**7.30, 22.30** Я перамог гэты боль.
**8.00, 23.00** Гісторыя хвароб.
**8.40, 23.40** Як не страціць здароўе.
**9.10, 18.50, 0.10** Энцыклапедыя памылак.
**9.35, 0.35** Школа розуму.
**10.10, 1.10** Генезіс здароўя.
**11.00, 2.00** Практыка здароўя.
**11.40, 2.40** Зялёная аптэка.
**12.20, 3.20** Клінічны гіпноз.
**12.50, 14.00, 3.50** Шлях да здароўя.
**13.30, 4.30** Спорт для дзяцей.
**15.20** Я расту.
**15.50** Пра дыеты і не толькі.
**16.30** Панацэя.
**17.00** Выкрыццё прадуктаў.
**17.40** Вялікая прабежка.
**18.10** Кабінет прыгажосці.
**19.05** Гэта карысна ведаць!

### TRAVEL

**8.00, 13.00, 17.00, 20.00, 0.00, 5.00** Сусветны падарожнік.
**9.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
**10.00** The Ethical Hedonist.
**11.00, 1.00, 6.00** Планета ежы.
**12.00, 7.00** Хутка адкрыццё.
**12.30, 18.00, 7.30** Дзікія сэрцам.
**14.00, 19.00** Сафі Грыгсан на ўсходнім базары.
**14.30, 19.30** Шэф-кухар за мяжой.
**15.00** Падарожжа на поўдзень.
**15.30** Пра галоўнае.
**16.00** Мараплаўцы.
**18.30** Смак Мексікі.
**21.00, 2.00** Раскошныя падарожжы.
**22.00, 3.00** Шлях у Шаалінь.
**23.00, 4.00** Планета спорту.

### ANIMAL PLANET

**7.00, 19.15** Школа гарыл.
**7.25, 16.30** «Заасад Крыса Хамфры».
**7.50, 17.00** «Пагаворым з жывёламі».
**8.15, 16.00** Самае дзікае шоу.
**8.40** Усё пра сабак.
**9.10** Котак не любіць нельга.
**10.05, 21.05, 4.25** «Незвычайныя вынаходствы для жывёл».
**11.00** «Заатур Мікаэлы».
**11.55** Шатландскае таварыства абароны жывёл.
**12.20, 19.40** «SOS дзікай прыроды».
**12.50, 17.25, 6.10** «Уводзіны ў сабаказнаўства».
**13.45** Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
**14.40, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**15.30** «Рэха і сланы Амбазелі».
**18.20** Каранаваныя гадаванцы.
**22.00, 2.35** Выклік «Вялікай пяцёркі».
**22.55, 3.30** Паляўнічы на яд.
**23.50** Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
**0.45** Дзікія і небяспечныя.
**1.40** Дзікі крымінал.
**5.20** Рай для шымпанзэ.
**5.45** «Будні дэльфінаў».

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00, 23.45** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.00** Нашы дзеці.
**14.00, 1.00** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Маст. фільм.

# ЗВЯЗДОЎСКІ МОСТ

ЗВЯЗДА 95

**Сваю родную газету «Звязда», у якой адпрацаваў трыццаць гадоў, жартам, з добрым гумарам параўноўваю з пяшчотнай жывой істотай, якой штодзень патрэбна шмат свежай, якаснай ежы. Толькі ўчора надрукаваў фотарэпартаж з пагранічнай заставы з мноствам фотаздымкаў і тэкстам, а сёння зноў трэба збірацца ў дарогу, на пошук іншай тэмы. А там — як пашанцуе. Можна знайсці нешта вельмі цікавае, а бывае, як на паляванні: будзеш хадзіць у лесе тры дні, пераадольваць буraломы, а ў выніку ўбачыш рыжы хвост вавёркі і нічога больш. А бывае, што і гэтага не ўбачыш.**

Тое, пра што хачу расказаць, адбылося ў гарбачоўскі час, у так званую перабудову. Тэмай майго чарговага рэпартажу было жніво. Звычайная справа. Працаваў на палетках цэлы дзень, заданне рэдакцыі як быццам выканаў, але ж хацелася яшчэ ўбачыць нешта незвычайнае, каб рэдактар глянуў бы на мой здымак і сказаў: «Тое, што трэба! У нумар!». Але мне трэба вяртацца ў рэдакцыю, каб здаць здымкі са жніва. Я сядзеў побач з вадзіцелем, гартаў блакнот з запісамі і час ад часу паглядваў на гадзіннік. Праз сорак мінут з Маладзечна на Мінск будзе электрычка, і я павінен паспець на гэты рэйс.

Неяк я глянуў у той бок, дзе побач з дарогай ціха цякла рэчка. Над ёй па доўгім бервяне перабіралася бабулька гадоў пад семдзесят, а можа, і болей. Кожнае імгненне яна магла паслізнуцца і ўпасці ў ваду. Па звычцы, адразу ж сфатаграфаваў гэтае відовішча, потым пайшоў насустрач бабульцы, каб нечым дапамагчы ёй.

— Навошта вы так рызыкуеце? — пытаю.

— Іду ў суседнюю вёску купіць хлеба, запалак ды іншай дробязі, — адказвае яна. — Толькі дапамагаць мне не трэба, а то, не дай Божа, абодва звалімся ў рэчку.

На тым баку стаялі людзі, чалавек дзесяць, і глядзелі на нас.

— Бабуля, з якой нагоды там сабраліся людзі? Каго яны чакаюць? — пытаю.

— Убачылі, што спынілася ваша машына, вось і выйшлі паглядзець, хто гэта да нас прыехаў. Мо вы якое начальства? — пытае.

— Ды не, не начальства, я з газеты «Звязда». Убачыў вас і спыніўся.

— Вось і добра, ідзіце на той бок, да людзей. Яны ўсё вам раскажуць, а мне трэба спяшацца, бо зачыніцца крама.

У маёй сумцы два фотаапараты, японскія, вельмі дарагія. Я іх берагу як зрэнку вока. Не хапала мне ўпасці і вымачыць іх у вадзе. Ніякіх грошай не хопіць на рамонт гэтай апаратуры. Потым даказвай у бухгалтэрыі, што быў цвярозы. Во будзе смеху!

Але ж трэба ісці. Вельмі асцярожна дабраўся на той бок рэчкі і апынуўся сярод людзей, якія з цікаўнасцю назіралі за мной. Я быў пры гальштуку, у акулярах (добра, што без капелюша). Людзі, напэўна, вырашылі, што я нейкі начальнік, і ўсе разам, адначасова сыпанулі на мяне безліч пытанняў. Я слухаў, маўчаў і чакаў, калі наступіць нейкая паўза. Сказаў, што журналіст, супрацоўнік газеты «Звязда», што ўпершыню трапіў у гэтую вёску, і папрасіў, каб яны па чарзе, спакойна расказалі пра свае праблемы.

Размова працягвалася дзве гадзіны. У вёсцы Ляхі жывуць 25 чалавек, усе пенсіянеры. У свой час яны добра і доўга працавалі, цяпер — на заслужаным адпачынку.

— Цяпер мы нікому не патрэбныя, — казалі яны, — быццам зношаны матэрыял, бо за апошнія пяць гадоў да нас не наведаўся ні адзін (!) хоць бы нейкі начальнік з раёна.

А праблема вось яна, перад вамі. Людзям, старым і нямоглым, даводзіцца наведваць суседнюю вёску Сакалоўку, дзе можна купіць самае неабходнае. Да Сакалоўкі можна дабрацца, але спачатку трэба пераадолець рэчку Вепратку. Вось тут і пачынаюцца сур'ёзныя выпрабаванні. Бываюць дні, асабліва вясной, калі Вепратка выходзіць з берагоў і жыхары аказваюцца ў становішчы, у якое трапіў некалі Рабінзон Круза.

Пажылым людзям, акрамя крамы, час ад часу патрэбна «хуткая дапамога». Дабрацца медыкам да хворага гэтак жа немагчыма, як немагчыма нырнуць у Вепратку і вынырнуць з Вілейскага вадасховішча. А яшчэ тут быў страшны выпадак: трэба было перанесці на той бераг труну з нябожчыкам (там могілкі), і яе ледзь не ўтапілі.

Сярод маіх субяседнікаў аказаўся чалавек з гумарам.

— На мінулым тыдні, — расказваў ён, — па тэлевізары паказвалі такую гульню: маладыя, здаровыя хлопцы і дзяўчаты пераадольвалі нейкія рэчкі і іншыя перашкоды. Рабілі яны гэта дзеля ўласнага задавальнення ў час адпачынку. Дык гэта амаль тое самае, што мы робім штодзённа, у любое надвор'е на працягу многіх гадоў. Толькі нас не паказваюць па тэлевізары, як тых спартсменаў.

— Цяпер уся надзея на газету «Звязда». Магчыма, пра нашы пакуты прачытаюць у высокіх кабінетах вялікія начальнікі і дапамогуць нам, — казалі мне людзі на развітанне.

Матэрыял пад назвай «Амаль Рабінзоны» аператыўна быў пастаўлены ў чарговы нумар. Канкрэтна і наглядна, з фотаздымкам (бабулька на бервяне), з крытыкай мясцовай улады, з прозвішчамі кіраўнікоў Вілейскага раёна.

Такім чынам, матэрыял я напісаў і надрукаваў у газеце, быццам, сваю частку работы і выканаў. І ўсё ж, на мой погляд, гэта самае лёгкае і нязначнае. Таму і не было задавальнення: галоўнай мэты не было дасягнута. Людзі ж па-ранейшаму заставаліся без моста.

Зразумела, што пабудаваць яго нават цераз невялікую рэчку — справа нялёгкая. Патрэбны будаўнічыя матэрыялы, рабочая сіла, грошы.

Газетную публікацыю я накіраваў у самыя розныя ўстановы, якія маюць дачыненне да вясковага жыцця — у раённы і абласны выканкамы, у федэрацыю прафсаюзаў, а таксама двум кіраўнікам моцных (галоўнае — багатых) прамысловых прадпрыемстваў, якіх добра ведаў асабіста. Прасіў дапамагчы жыхарам вёскі Ляхі і пералічыць у райвыканкам столькі грошай, колькі могуць. У гэтай справе мне дапамог рэдактар нашай газеты. Ён падтрымаў ідэю, даў некалькі разумных парад. Трэба аддаць належнае Яўгену Іосіфавічу Язінскаму, які ў той час быў старшынёй Вілейскага райвыканкама. У сваім матэрыяле я жорстка крытыкаваў яго, і трэба сказаць, што ён зрабіў правільныя вывады. На працягу месяца амаль усе праблемы (з матэрыяламі і грашыма) былі вырашаны. Яўген Іосіфавіч запатрабаваў ад падначаленых неадкладна брацца за справу, а не спасылацца на «аб'ектыўныя» прычыны. Прыехаў на месца будучага моста галоўны інжынер упраўлення капітальнага будаўніцтва Аляксандр Карасцялёў, зрабіў тэхнічныя разлікі. Прыйшоў на дапамогу дырэктар мясцовага саўгаса Юрый Гірук. Знайшоўся ў вёсцы добры цясляр, сапраўдны майстар сваёй справы Іван Вялічка, паклікаў сваіх сяброў — і праблема, якая чакала свайго вырашэння шмат гадоў, нарэшце скранулася з мёртвай кропкі.

Прывезлі бярвёны. Будаўнікі апрацоўвалі іх на месцы. Галоўным інструментам ва ўмелых руках была звычайная сякера. Я амаль штодзённа цікавіўся, як там ідуць справы, двойчы наведваўся на гэты «аб'ект». Шчыра радаваўся, што ўсё рухаецца як трэба. У людзей добры настрой, а ў мяне — проста цудоўны: здавалася, што спявае кожная клетачка маёй душы. У тыя дні яшчэ раз пераканаўся: газетнае слова мае вялікую сілу.

...Заканчвалася «залатая» восень. Сіноптыкі абяцалі дажджы, часам моцныя. Хацелася добрага надвор'я яшчэ хоць адзін тыдзень, каб завершыць справу. Гэта добра разумелі і тыя людзі, якія там працавалі. Яны нават адмовіліся ад перапынку на абед, харчы бралі з сабою, каб не губляць часу.

У рэдакцыйным доўгім калідоры Дома друку насустрач мне ішоў чалавек, спыняўся і чытаў на дзвярах шыльдачкі з прозвішчамі. Я павітаў яго і спытаў, каго ён шукае. Чалавек назваў маё прозвішча. Мы пазнаёміліся.

— Як добра, што я вас знайшоў! — гаворыць ён. — Мне старшыня райвыканкама загадаў прывезці вас на адкрыццё моста.

Гэта была лепшая навіна за апошнія тры месяцы.

Прыехалі. Мост-прыгажун узняўся над Вепраткай, надзейна лёг на яе берагі. Яшчэ стаяў цудоўны смаляністы пах. Сабраліся ўсе жыхары на сярэдзіне моста, прыехалі супрацоўнікі райвыканкама на чале са старшынёй, іншыя госці. Пахвалілі працу будаўнікоў, сказалі шмат сардэчных слоў у адрас газеты «Звязда», адзначылі яе моц і аўтарытэт. Гаварылі пра тое, што яна першай узняла праблему і ўвесь час трымала на кантролі ход работы. Нехта з ветэранаў сказаў, што з гэтага часу і далей назаўсёды мост будзе называцца «звяздоўскім». Людзі гаварылі шчыра — гэта адчувалася ў кожным слове.

Быццам салют завершанай справе «стрэльнула» бутэлька шампанскага.

**Мікалай АМЕЛЬЧАНКА,**
**былы фотакарэспандэнт «Звязды».**

## «РАНІЦАЙ ХОДЗІЦЬ ШКОЛЬНЫ АЎТОБУС. ХАДАЙНІЧАЛІ, КАБ ЗІМОЙ ВЯРНУЛІ І МАРШРУТКУ»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Пярэжыр Пухавіцкага раёна патэлефанавала Аксана Валер'еўна Крук. Расказала пра тыя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца бацькі маленькіх дзетак пры дастаўцы іх у дзіцячы садок суседняй вёскі Зазер'е. Ад Пярэжыра да яе — 5-6 кіламетраў.**

— Раней са сталічнай аўтастанцыі «Аўтазаводская» хадзіла маршрутка. На ёй бацькі і адвозілі дзетак у дзіцячы садок. Але цяпер часова — да 1 красавіка — рух той маршруткі прыпынены. Да Зазер'я раніцай мусім дабірацца хто як можа: калі калгасным транспартам, калі не выпадае — дык пехам. Увечары вяртаемся таксама як пашанцуе: хто спадарожную машыну «зловіць», хто каго папросіць забраць іх з дзецьмі. Звярталіся ў райвыканкам, прасілі: дайце, маўляў, хоць бы на зімовы час транспарт, каб дзяцей можна было вазіць у садок. Але сітуацыя так і не змянілася. Можа, вы чым дапаможаце? — пыталася заяўніца.

Мы звязаліся з аддзелам адукацыі Пухавіцкага раённага выканаўчага камітэта, агучылі пытанні бацькоў (Аксана Валер'еўна, натуральна, звярталася не толькі ад свайго імя: паводле яе слоў, толькі з іх вёскі і суседняй у Зазер'і садок наведваюць дванаццаць дзетак).

— За дзяржаўнай установай адукацыі «Пярэжырская сярэдняя школа імя Гурыновіча» замацаваны аўтобус для падвозу дзетак на вучобу, — адказалі рэдакцыі «Звязды». — Бацькі, якія жадаюць даставіць дзяцей у дзяржаўную ўстанову адукацыі «Зазерскі яслі-сад», могуць скарыстацца гэтым транспартам у ранішні час. У вячэрні час развоз не ўяўляецца магчымым з-за заканчэння вучэбных заняткаў у 15.00.

У зімовы перыяд маршрут Мінск — Узляны — Мінск, на якім бацькі дастаўляюць дзяцей з вясны да восені ў дашкольную ўстанову, закрыты ў сувязі з заканчэннем дачнага сезона, пацвердзілі нам далей.

— Аддзел адукацыі накіраваў хадайніцтва ў РУП «Мінаблаўтатранс» аб узнаўленні гэтага маршрута ў зімовы час, — прагучала напрыканцы добрай навінай для бацькоў дашкольнікаў.

Вядома, пытанне яшчэ трэба канчаткова вырашыць, але пакуль і варыянт з хоць бы ранішняй гарантаванай дастаўкай школьным аўтобусам дзетак у яслі-сад падаецца не такім ужо і дрэнным. Наша чытачка, нагадаем, скардзілася, што раніцай бацькам даводзіцца самастойна вырашаць гэтую праблему.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Сёння тэлефанаваць у даведку можна бясплатна

**З нагоды свайго 15-годдзя тэлефонная даведачная інфармацыйная служба «Інфалінія-185» праводзіць акцыю: у дзень свайго заснавання, 3 лютага, пазваніць у даведку па нумары 185 можна будзе абсалютна бясплатна з любога тэлефона краіны (акрамя мабільнага аператара «Лайф»). Генеральны дырэктар СТАА «Белфакта Медыя» Алег ЦЕЦЕРАЎ напярэдадні юбілею (а «Інфалінія-185» з'яўляецца адным са структурных падраздзяленняў «Белфакта Медыя») расказаў журналістам, як развіваўся гэты сэрвіс і якія перспектывы мае даведка па тэлефоне:**

— У прынцыпе, структура тыповых запытаў за 15 гадоў не памянялася: зараз, як і раней, больш за ўсё пытаюць пра тавары і паслугі, пра кантактную інфармацыю прадпрыемстваў і арганізацый. Бо вельмі часта фірмы пераязджаюць, мяняюць офісы, і людзі шукаюць сваіх партнёраў. Плюс з часам з'яўляюцца дадатковыя запыты: напрыклад, раней не было iPad'аў, таму і не пыталіся, дзе можна іх купіць ці адрамантаваць. А сёння — пытаюцца.

Бывае, што ў лідары выбіваюцца і іншыя запыты. Напрыклад, як патлумачыла **Таццяна ПАПКОВА, кіраўнік службы сэрвісу «Інфалінія-185»**, у 2011 годзе вельмі часта пыталіся, дзе і па якім курсе купіць валюту. Таксама адчувае інфалінія і іншыя актуальныя падзеі:

— Як толькі адбываюцца трагічныя сітуацыі — мы гэта адчуваем адразу, бо людзі звяртаюцца да нас, каб атрымаць патрэбную інфармацыю. І мы вымушаны тэлефанаваць і ў МНС, і ў МУС, каб даць людзям зваротную сувязь.

Усяго, як падлічылі супрацоўнікі інфаліні, за 15 гадоў яны прынялі прыкладна каля 35 мільёнаў званкоў. Дарэчы, па статыстыцы, амаль 85% званкоў, якія паступаюць на інфалінію, маюць працягласць менш за 1 хвіліну. 10% — 1-2 хвіліны, 3% — 2-3 хвіліны, а больш за тры хвіліны людзі з аператарамі размаўляюць вельмі рэдка — толькі ў 2% выпадкаў. Так што, як каментуе такую статыстыку Алег Цецераў, «кліент не плаціць за музыку» — інфармацыю яму стараюцца даць вельмі аператыўна. Дарэчы, сёння адна хвіліна размовы з аператарам «Інфалініі-185» каштуе 2-2,5 тысячы рублёў у залежнасці ад таго, адкуль вы тэлефануеце.

Хто і калі тэлефануе ў даведку? Па звестках, якія прывёў генеральны дырэктар СТАА «Белфакта Медыя», найбольш часта інфалініяй карыстаюцца менеджары і офісныя работнікі (19%), дзяржслужачыя (18%), а таксама бухгалтары, эканамісты і юрысты (18%). Менш за ўсё — студэнты (4%), пенсіянеры (4%) і прадстаўнікі сілавых структур (2%).

Журналісты спыталі ў Алега Васільевіча, ці адчувае даведка па тэлефоне канкурэнцыю інтэрнэту — бо сёння дастаткова «забіць» свой запыт у пошукавую сістэму і можна атрымаць інфармацыю на любы густ. Але Алег Цецераў лічыць, што пакуль даведку па тэлефоне рана спісваць з рахункаў:

**Анекдатычны выпадак з практыкі інфалініі**

*Зайшоў чалавек у прыбіральню ў рэстаране — а дзверы заклініла. Што рабіць? Ён не разгубіўся — патэлефанаваў у даведку і спытаў нумар тэлефона гэтага рэстарана. Ну а потым пазванiў туды і папрасіў, каб яго вызвалілі «з палону».*

— Інтэрнэт, безумоўна, канкурэнт. Але часта там інфармацыя недакладная. Таму мы звесткам з інтэрнэту не даваяраем на 100%. Мы іх крытычна ацэньваем і неправераную інфармацыю нашым кліентам не прадастаўляем.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ПРАГЭТА ГАВОРАЦЬ

### У Магілёве

#### ДАІ, КАХАННЕ І СВЯТЫ ВАЛЯНЦІН

**Незвычайную акцыю да Дня ўсіх закаханых правядзе Магілёўская ДАІ. Яна называецца «Вадзіцельская Love Story» і дапаможа выявіць лепшую сямейную аўтапару.**

Умовы конкурсу наступныя: муж і жонка на сваім аўтамабілі павінны выканаць некаторыя элементы паркоўкі, а потым прайсці экзамен (жартоўны) на веданне правілаў дарожнага руху. Сямейная пара, якая пакажа найлепшыя вынікі, атрымае падарункі ад ДАІ і спонсараў.

Конкурс будзе праходзіць напярэдадні Дня святога Валянціна, 11 лютага, а заявіць пра ўдзел можна па тэлефоне ў Магілёве: (0222) 47-20-63.

**Ілона ІВАНОВА.**

### У Мазыры

#### ДАЛЬНАБОЙШЧЫК ПАВЕСІЎСЯ?

**Кіроўца грузавога «Рэно» венгерскай фірмы, якая займаецца міжнароднымі грузаперавозкамі, знойдзены мёртвым у пятлі ў кабіне свайго аўтамабіля.**

Машына стаяла на абочыне дарогі ля мяжы з Украінай на адлегласці 5 км ад Мазыра. Як расказаў начальнік Мазырскага раённага аддзела следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Андрэй Грыб, падчас агляду кабіны аўтамабіля выяўлена, што парадак рэчаў у ёй не парушаны. Няма слядоў пранікнення ў фуру — не парушаны пломбы на аўтацягніку з грузам камп'ютарных камплектуючых, якія перавозчык вёз у Расію. На целе 46-гадовага мужчыны выяўлены апёкі на правай руцэ і назе, а на шыі — след ад вяроўкі. Пакуль разглядаецца версія самагубства, але па факце будзе праведзена праверка. Зараз аб здарэнні апавешчана консульства Венгрыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### На Віцебшчыне

#### КРАЛА І НЕ ЧЫРВАНЕЛА

**Пракуратурай Бешанковіцкага раёна заведзена крымінальная справа ў дачыненні да галоўнага бухгалтара адной з арганізацый.**

Супрацоўнікамі мясцовага аддзела ўнутраных спраў было ўстаноўлена, што яна, злоўжываючы службовымі паўнамоцтвамі, у перыяд з лістапада 2006 года па май мінулага года скрала бюджэтных грашовых сродкаў і грашовых сродкаў пазабюджэтнага фонду на агульную суму звыш 12 мільёнаў рублёў. Жанчыну звольнілі з пасады. Яна часткова кампенсавала шкоду.

#### ХАБАР ЗА «БАЛЬНІЧНЫ»

Заведзена крымінальная справа ў дачыненні да загадчыка аддзялення адной з паліклінік Оршы, які атрымаў ад беспрацоўнага хабар у памеры 280 тысяч рублёў за спрыяльнае вырашэнне пытання аб выдачы фіктыўнага лістка непрацаздольнасці. Следчы камітэт распачаў справу па выніках праверкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### У Жлобіне

#### НЕБЯСПЕЧНЫ МЕТАЛАЛОМ

9 падствольных гранат маркі «ВОГ-25» сучаснай вытворчасці былі знойдзены сярод металалому пры пагрузцы вагона на адкрытай пляцоўцы часовага захавання аднаго з цэхаў БМЗ у Жлобіне. Небяспечная знаходка знішчана сапёрамі в/ч 5527 Бабруйска.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### У Баранавічах

#### РАЗАБРАЎСЯ...

**Жыхар в. Забалоцце (Баранавіцкі раён) прыехаў дамоў з Масквы, дзе працуе ахоўнікам у супермаркеце. Батарэі ў кватэры былі ледзь цёплымі, і мужчына пайшоў у кацельню разбірацца. Заявіўся туды ў форме, з дубінкай і наручнікамі. Стукнуў качагара некалькі разоў кулаком у твар, а затым наручнікамі прышпіліў да батарэі.**

Жанчына, якая была сведкай усяго гэтага, падумала, што мужчына служыць у расійскай паліцыі. Патэлефанавала «сваім» міліцыянерам, якія і затрымалі «калегу».

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Заседание внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Слепянка» будет проводиться по адресу:** г. Минск, ул. Менделеева, 1/17 10.02.2012 г. в 11.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О присоединении ОАО «Слепянка» к ООО «Евроторг».
2. О взаимодействии ОАО «Слепянка» и ООО «Евроторг» в процессе присоединения ОАО «Слепянка» к ООО «Евроторг».
3. Об утверждении Договора о присоединении ОАО «Слепянка» к ООО «Евроторг».
4. Об утверждении передаточного акта в процессе присоединения ОАО «Слепянка» к ООО «Евроторг».

*УНП 100199509*

Чытач прапануе



## ЗБОР МАКУЛАТУРЫ ЯК ПРАЯЎЛЕННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СВЯДОМАСЦІ

**НАШ КАМЕНТАРЫЙ**

**Начальнік упраўлення абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей КУЗЬМЯНКОЎ:**

*Як эколаг я толькі «за». Макулатура будзе падзелена, з вільготнасцю таксама будзе ўсё ў парадку. Але ўсё не так проста, як здаецца на першы погляд, таму што ўсё ж такі ўзнікаюць пытанні санітарнай і пажарнай бяспекі. Так што справа гэта добрая, але яна павінна быць таксама добра прадумана і арганізавана.*

**Рэдакцыя атрымала ліст ад свайго пастаяннага чытача Уладзіміра Дземчанкі з в. Машканы Сенненскага раёна, у якім Уладзімір Сцяпанавіч прапануе схему арганізацыі збору макулатуры.**

Напрыклад, у жыллёвым сектары можна зрабіць так:

**1.** правесці агітацыйна-тлумачальны сход з жыльцамі кожнага шматкватэрнага дома (большасць з іх, несумненна, адгукнецца);

**2.** на ніжняй пляцоўцы кожнага пад'езда паставіць бляшаную скрынку для макулатуры з накрыўкай (для папярэджання загарання);

**3.** працаўнікі ЖКГ па прыбіранні пад'ездаў перыядычна павінны ўпакоўваць макулатуру ў папяровыя мяхі двух колераў (для кардону і паперы). Мяхі з макулатурай могуць захоўвацца ў тамбуры ўвахода ў падвал дома;

**4.** атрымаўшы тэлефоннае паведамленне ўпраўдома або дыспетчара ЖЭУ, прадстаўнік нарыхтоўчай арганізацыі павінен прыехаць на транспарце і прыняць макулатуру ў мяхах, а ўзамен выдаць іншыя папяровыя мяхі і квітанцыю.

Выкарыстанне атрыманых за макулатуру грошай агаворваецца на сходзе жыльцоў. Для ЖКГ мінімум турбот, а макулатура будзе якаснай.

Але асноўным пастаўшчыком макулатуры, на думку Уладзіміра Дземчанкі, павінны быць дзяржаўныя структуры і пункты рознічнага гандлю, якія павінны атрымаць заданне па здачы макулатуры. На гэта не спатрэбіцца дадатковых намаганняў, дастаткова толькі класці сапсаваную і непатрэбную паперу ў спецыяльную ёмістасць. Прыбіральшчыца будзе перакладваць макулатуру ў папяровы мяшок і адносіць у адведзенае месца, а забіраць яе будуць зноў жа прадстаўнікі нарыхтоўчай арганізацыі.

**На заметку**

*✓Згодна з інфармацыяй канцэрна «Беллеспапераапрам», які аб'ядноўвае вядучыя прадпрыемствы па перапрацоўцы макулатуры ў краіне, за 2011 год на прадпрыемства паступіла 209,8 тысячы тон макулатуры. Гэтая макулатура перапрацоўваецца з наступным выпускам кардону і паперы, у асноўным газетнай, шпалернай, упаковачнай.*

*✓Для вытворчасці 960 тон паперы трэба 5-6 кубічных метраў драўніны.*

**Святлана БУСЬКО.**

**Ну і ну!**

## НЕ СТРЫМАЎСЯ...

**Мужчына выліў на галаву былой жонцы суп толькі за тое, што яна яго «пілавала». Ды яшчэ талерку аб галаву разбіў.**

Як расказаў «Звяздзе» памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна Віцебска Аляксандр Дзядзюра, былыя муж і жонка пражывалі разам. У той дзень экс-жонка прапанавала экс-мужу паесці, а ён разліў суп на падлогу... Жанчына, убачыўшы разліты суп, пачала «яго выхоўваць». Маўляў, яшчэ і падлогу прыбіраць прыйдзецца. Натуральна, мужыку «выхаваўчы працэс» не спадабаўся. Каб не нарвацца на канфлікт, жанчына выйшла ў ванны пакой.

Абураны былы муж прыйшоў у ванную і выліў жонцы на галаву суп, які яшчэ заставаўся ў талерцы. А потым разбіў талерку аб яе галаву. Жонка выклікала міліцыю.

Хуліган ужо асуджаны. Прыгаворам суда Кастрычніцкага раёна яго пазбавілі волі тэрмінам роўна на 1 год і 1 дзень. Праўда, з адтэрміноўкай выканання пакарання на год. Яго прымусова будуць лячыць ад хранічнага алкагалізму. Раней мужчына ўжо быў судзімы — за няўплату аліментаў і пагрозу забойствам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Утверждено
Решение Крупского
районного исполнительного
комитета
23.01.2012 № 83

План приватизации объектов, находящихся в собственности Крупского района на 2012–2014 годы

Раздел I. Коммунальные унитарные предприятия, имущественные комплексы которых подлежат приватизации

| № п/п | Наименование коммунального унитарного предприятия | Предполагаемый срок преобразования |
|---|---|---|
| 1 | Коммунальное производственное унитарное предприятие «Крупский деревообрабатывающий комбинат» | 2012 год |

*В соответствии с инструкцией «О порядке организации и проведения общественного обсуждения градостроительных проектов, вопросов благоустройства жилищного и иного строительства», утвержденной решением Мингорисполкома от 20 апреля 2006 года № 718, администрацией Заводского района г. Минска с 2 февраля по 7 марта 2012 года*
**будет проведено общественное обсуждение проекта: «Многоквартирный жилой дом в районе пересечения пр. Партизанского — ул. Ванеева».**

**График проведения общественного обсуждения:**

**21.02.2012 в 17.00** в администрации Заводского района г. Минска по ул. Жилуновича, 17, каб. 34 пройдет представление вышеуказанного проекта, выносимого на общественное обсуждение.

**С 22.02.2012 по 07.03.2012** в расчетно-справочном центре по ул. Жилуновича, 29 будут выставлены для ознакомления материалы по проекту: «Многоквартирный жилой дом в районе пересечения пр. Партизанского — ул. Ванеева».

УНП 800005787

***ИП «Атлант-М Строй»***

Утерянный **аттестат СШ № 98** г. Минска, выданный Рипинской Наталье Евгеньевне, **считать недействительным**.

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Частного производственного унитарного предприятия «Гомельобои» (продавец)**

**извещает о проведении 7 марта 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи, с НДС, руб. РБ | Задаток, с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой пикап TOYOTA X4 1989 года выпуска гос. № AI 0688-3, требует проведения ремонтно-восстановительных, окрасочных работ, доукомплектования | 60 337 037 | 6 000 000 |
| 2 | Легковой вагон FORD TRANZIT 1994 года выпуска гос. № 0671 ЕК-3, состояние неисправное, требует проведения ремонтно-восстановительных, окрасочных работ | 16 880 787 | 1 600 000 |
| 3 | Легковой седан GAZ-3110 1997 года выпуска гос. № 0441 ЕК-3, неисправное, не на ходу, требует проведения ремонтно-восстановительных, окрасочных работ | 9 776 341 | 900 000 |

**Продавец: ЧПУП «Гомельобои», ул. Севастопольская, 45, г. Гомель, контактные телефоны: 36 31 56; 8 029 338 24 07; 8 029 602 12 61.**

**Имущество расположено по адресу: ул. Севастопольская, 45, г. Гомель.**

**Шаг аукциона – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо от даты опубликования настоящего извещения по 5 марта 2012 года включительно:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (ЧПУП «Гомельобои») р/с 3012517410016 в отд. № 316 ГФ по Гомельской обл. ОАО «Белинвестбанк», МФО 151501768, УНП 810001080.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов, подписать соглашение по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 89 64, 74 17 34 и на сайте gomeloblreklama.by**

Смачнае — карысна

# НЕ КЛАДЗІЦЕ МЁД У КІПЕНЬ!



**Натуральны мёд у гаспадарцы — рэч незаменная. Гэта сапраўдная кладоўка лекавых рэчываў. Ужо сотні гадоў яго ўжываюць пры хваробах лёгкіх, сардэчным болі, з поспехам лечаць ім раны, захворванні скуры. У штодзённым рацыёне чалавека мёд павінен прысутнічаць абавязкова — бо з 24 мікраэлементаў, неабходных нашаму арганізму, у гэтым прадукце змяшчаецца 22!**

## МЯДОВЫЯ РЭЦЭПТЫ

❍ Пры запаленчых захворваннях глоткі, гартані і трахеі рэкамендуюць прымаць сумесь мёду з сокам альясу. Зрэзанае ніжняе лісце альясу трэба прамыць вадой, нарэзаць на дробныя кавалачкі і адціснуць сок. Мёд развесці сокам альясу 1:5 і прымаць па 1 ч. лыжцы да яды 3 разы на дзень на працягу 1—2 месяцаў.

❍ Для лячэння хранічнага бранхіту: пяць лісцікаў альясу здрабніць, расцерці з 1 ст. лыжкай мёду і трыма сырымі жаўткамі. Атрыманую масу заліць адной бутэлькай кагору і пакінуць на 5 дзён. Піць па 1 ст. лыжцы 4 разы на дзень.

❍ Гарчыцу, мёд, алей і муку (усё па 1 ст. лыжцы) змяшаць і выкласці тонкім пластом у выглядзе аладкі на грудную клетку. Кампрэс лепш рабіць на ноч.

❍ Сумесь мёду, каліны, сметанковага масла і спірту (усё па 1 ст. лыжцы) дапамагае пры кашлі. Прымаць на працягу дня па 1 ч. лыжцы, запіваючы цёплым малаком або гарбатай.

❍ Для ўмацавання сардэчнай мышцы прыгатуйце такое «лякарства»: курагу, разынкі, арэхі (усё па 100 г) і адзін лімон прапусціце праз мясарубку, дадайце 100 г мёду і перамяшайце, каб атрымалася аднародная маса. Прымайце па 2 дэс. лыжкі 2 разы на дзень.

❍ Пры слабасці сасудаў і павышанай кровазачывасці ўжывайце па 100 г мёду ў суткі, разводзячы яго ў настоях траў (крываўніку, кары дуба, хвашчу палявога).

❍ Сродак ад бессані: 2 ч. лыжкі мёду размяшаць у палове шклянкі цёплай вады і выпіць за паўгадзіны да сну. Альбо можна перад сном выпіць 1/2 шклянкі мятнай гарбаты з 1 ст. лыжкай мёду.

❍ Ванна з настоем календулы і мёду расслабляе і здымае стомленасць. Заліце 50 г сухіх кветак календулы 0,5 л кіпеню, растварыце 3 ст. лыжкі мёду і дадайце ў ванну.

❍ Каб нармалізаваць работу страўнікава-кішачнага тракту, прыгатуйце мядовы напой: 1 ч. лыжку мёду развядзіце ў 1/2 шклянкі вады пакаёвай тэмпературы. Пры паніжанай кіслотнасці піце мядовы напой за 15 хвілін да яды, а пры павышанай — за 45 хвілін да яды. Для тых, хто пакутуе ад гастрыту, у мядовы раствор варта дадаць чайную лыжку пылку.

❍ Для аднаўлення сіл пры сардэчна-сасудзістых, бронхалёгачных, страўнікава-кішачных і іншых захворваннях каштоўным лячэбна-прафілактычным прадуктам з'яўляецца мядова-дражджавая паста: 1 кг свежых пякарскіх дражджэй варыць 2 гадзіны ў адным літры вады з дабаўленнем 400 г цукровага пяску. Пасля гэтага дадаць 2,6 л вады і кіпяціць 20 хвілін. Сумесь уліць у састаў, які змяшчае 200 г жытняй мукі, 200 г сметанковага масла. Астудзіць да 30°C і дадаць 300 г мёду. Захоўваць у халадзільніку. Прымаць па 2 ст. лыжкі 3 разы на дзень.

❍ Жанчынам для захавання маладосці, прыгажосці і здароўя раім правесці такі эксперымент. Тры разы на дзень выпіваць па паўшклянкі цёплай вады, у якой разведзена чайная лыжка мёду, выконваючы тры правілы: 1) мядовы раствор выпіваць павольна, маленькімі глыткамі, перад ядой. Пры паніжанай кіслотнасці — за паўгадзіны да яды; 2) паспрабаваць на час эксперыменту адмовіцца ад цукру або звесці яго ўжыванне да мінімуму; 3) ужываць мёд не менш як паўгода. Вы забудзецеся пра бяссонніцу і галаўныя болі. Скура стане аксамітнай і гладкай, умацуюцца валасы, а страўнік будзе працаваць з дакладнасцю гадзіннікавага механізму.

❍ Настой рамонку з мёдам змякчае валасы і надае ім бляск: 20 г сухіх кветак рамонку лекавага заліць шклянкай гатаванай вады, настойваць 40—50 хвілін, працадзіць, адціснуць, дадаць да настою 3 ч. лыжкі мёду і размяшаць. Папярэдне вымытыя валасы намачыць настоем. Праз 40—50 хвілін валасы прамыць цёплай вадой.

❍ Прыгатуйце мядовы крэм для рук: 3 ст. лыжкі гліцэрыны, 1 ч. лыжка нашатырнага спірту, крышку бураксу на кончыку нажа, 1 ч. лыжка мёду і паўшклянкі вады. Перад нанясеннем сумесь узбоўтаць.

❍ З'явіліся трэшчыны на пятках? Зрабіце спачатку содавую ванначку для ног, а затым намажце пяткі лекавай сумессю з аліўкавага алею і мёду ў суадносінах 1:1.

❍ Для змякчэння скуры цела добрыя мядовыя ванны — 100—150 г мёду на ванну. Паляжаць у мядовай ванне хвілін 20 пры тэмпературы 40°C, затым спаласнуцца без мыла.

❍ Для ўсіх тыпаў скуры карыснае вячэрняе ўмыванне мядовай вадой: у шклянцы цёплай вады растварыць чайную лыжку мёду.

Увага! Пры алергіі на пылок раслін і павышанай адчувальнасці да мёду выкарыстанне яго супрацьпаказана.

## МЯДОВЫЯ САКРЭТЫ

❍ Ужывайце мёд за гадзіну—паўтары да яды. І не глытайце, а трымайце ў роце, пакуль не рассмокчаце, як цукерку. Не варта дадаваць яго ў гарачую гарбату, малако: ад высокай тэмпературы прадукт страчвае свае цудадзейныя ўласцівасці, ператвараючыся ў звычайны ласунак. Лепш ужывайце яго «ўпрыкуску».

❍ Мёд можна піць толькі з цёплай травяной гарбатай. Мёд і гарачая чорная гарбата — антыподы. Па-першае, з-за высокай тэмпературы. Па-другое, яны маюць процілеглую накіраванасць: гарбата ўзбуджае, а мёд заспакойвае.

## ВЫБІРАЕМ МЁД

❍ Каб купіць спелы мёд, выберыце самы густы на прылаўку. Калі мёд вадкі і не ўтрымліваецца на палачцы, значыць, ён няспелы. Улетку гэта больш прыкметна, паколькі з надыходам халадоў ён пачынае гуснуць. Мёд павінен сцякаць з нажа роўным струменьчыкам.

❍ Пакупнік любіць, каб было смачна і карысна. Але гэтага мала. Яму трэба, каб было прыгожа. Напрыклад, нам прапануюць два слоікі з празрыста-бурштынавым і мутным бялёсым прадуктам. Зразумела які выберам. Аднак, купляючы вадкі празрысты мёд, мы і не падазраём, што тут штосьці можа быць не так. А крышталізацыя ж — дакладная прыкмета якасці і натуральнасці мёду. Крышталізуецца ён ад двух тыдняў да двух месяцаў. Вельмі рэдка гэты тэрмін дасягае аднаго года (толькі ў тым выпадку, калі мёд акацыевы або каштанавы). Таму, калі бліжэй да вясны прадавец, прапануючы вадкі і празрысты мёд, сцвярджае, што гэты мёд свежы і нядаўна адпампаваны з сотаў, не сумнявайцеся: гэта няпраўда. Хутчэй за ўсё, каб спыніць працэс браджэння няспелага няякаснага мёду, яго разагрэлі да 80—100 градусаў. Ён стаў прыгожым, але пры гэтым цалкам страціў свае карысныя якасці.

❍ Выбіраючы мёд, звярніце ўвагу і на форму крышталікаў. Добры мёд зацукроўваецца дробнымі крышталікамі, якія нагадваюць муку. Калі крышталікі буйныя, мёд фальсіфікаваны — пчаляр карміў пчол сіропам.

❍ Яшчэ адна прыкмета: на марозе мёд утварае шклопадобныя ніткі. З натуральным вадкім мёдам гэта адбываецца толькі на добрым марозіку. Грэты ж мёд, пачынаючы ўжо з пяці градусаў цяпла, утварае шклопадобныя ніткі. У яго яшчэ прысмак карамелек, які можна вызначыць, проста паспытаўшы яго.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Лемінг. Пінгвін. Дамаск. Праца. Насечка. Сул. Салют. Лета. Батрак. Але. Аскет. Дэлі. Наклад. Ушу. Плётка. Гоні. Рак. Дар. Манат. Аброк. Дуб. Раёк. Страха. Адвал. Мара. Ілот. Салавей. Каламбур.

**Па вертыкалі:** Цюлень. Снег. Алень. Аск. Луідор. Чардаш. Ака. Інда. Дуўр. Паска. Кадмій. Гамер. Вал. Адлік. Прарок. Пясец. Лата. Астат. Мыс. Ялта. Плед. Эстрада. Стол. Катух. Ірак. Балівар.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.54 | 17.53 | 8.59 |
| Віцебск — | 8.48 | 17.39 | 8.51 |
| Магілёў — | 8.44 | 17.43 | 8.59 |
| Гомель — | 8.35 | 17.45 | 9.10 |
| Гродна — | 9.08 | 18.09 | 9.01 |
| Брэст — | 9.04 | 18.15 | 9.11 |

### Месяц

*Першая квадра 31 студзеня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

### Імяніны

***Пр.** Агніі, Валяр'яна, Ілы, Максіма, Яўгена.*

***К.** Яны, Блажэя, Іпаліта.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 3 лютага

### Дзве даты

**1740 год** — заснаваны Нясвіжскі тэатр Радзівілаў. Існаваў у Нясвіжы па 1791 год. У спектаклях разам з прыгоннымі ўдзельнічалі члены княжацкай сям'і, шляхта, кадэты нясвіжскага корпуса (першы спектакль — «Прыклад справядлівасці»). Спектаклі ў суправаджэнні Нясвіжскай капэлы Радзівілаў праходзілі ў адмысловым будынку «Камедыенхаўз», у прадмесці Нясвіжа Альбе пад адкрытым небам і ў палацы «Кансаляцыя». Спектаклі ставіліся на польскай, італьянскай, нямецкай і французскай мовах. У рэпертуары тэатра былі творы Ф. У. Радзівіл: камедыі «Дасціпная каханне», «Убачанае не праходзіць», трагедыі «Суддзя, пазбаўлены розуму», «Золата ў агні», оперы «Сляпое каханне не думае пра канец», «Шчаслівае няшчасце». У 1753—62 гг. князь М. К. Радзівіл Рыбанька надаў тэатру прафесійны характар: папоўніў трупу акцёрамі, стварыў пры капэле Нясвіжскую музычную школу і Нясвіжскую балетную школу, аркестр народных інструментаў, павялічыў прыдворных капэлу. Рэпертуар папоўніўся новымі творамі Ф. У. Радзівіл, камедыямі Мальера, Вальтэра, В. Ржэвускага, італьянскімі і нямецкімі камічнымі операмі і балетамі і інш.



**1809 год** — нарадзіўся Якаб Людвіг Медэльсон, кампазітар, піяніст, арганіст, дырыжор, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў нямецкага рамантызму. У 10 гадоў ён пачаў складаць музыку і за паўтара года напісаў каля пяцідзесяці твораў. Выпускнік Берлінскага ўніверсітэта, ён сябраваў з Гумбальтам і Гейне, Гофманам і Вэберам, Гётэ і Гегелем. Пад яго кіраўніцтвам былі ўпершыню выкананы многія творы Гендэля, Баха, Бетховена, Моцарта. У 1843 годзе па ініцыятыве Мендэльсона адкрылася Лейпцыгскі кансерваторыя. А «Вясельны марш» — фрагмент з оперы «Сон у летнюю ноч» — зрабіў яго імя вядомым ва ўсім свеце.

### Цытата дня:

***«Бруд, калі ён зверху, адмываецца, а вось калі душа чорная, яе ніколі не адмыеш!»***

**Мікола Ваданосаў (1923—2006), беларускі пісьменнік.**

## Здарэнне

### ЗНЁС МАЧТУ АСВЯТЛЕННЯ

**Чарговае дарожна-транспартнае здарэнне ў Мінску: легкавы аўтамабіль «СангЁнг Каранда» ўрэзаўся ў мачту вулічнага асвятлення.**

38-гадовы кіроўца не справіўся з кіраваннем. Аварыя адбылася а палове восьмай раніцы на праспекце Пераможцаў. Да месца здарэння быў накіраваны аварыйна-выратавальны аўтамабіль і брыгада хуткай дапамогі. Работнікі МНС без выкарыстання гідраўлічнага інструмента і спецыяльных сродкаў дэблакіравалі кіроўцу. Мужчына атрымаў удар каленнага сустава, але ад шпіталізацыі адмовіўся. Разбор здарэння праводзіць УДАІ Заводскага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Усміхнемся

☺ **10 прыкмет таго, што на вуліцы моцны мароз.**

✓Птушкі лятаюць кароткімі перабежкамі.
✓Даішнікі ходзяць з намёртва прымерзлымі свістулькамі.
✓Многія жанчыны замест памады карыстаюцца лыжнай маззю.
✓Мужчыны раскідваюць па ўсёй кватэры вязаныя ваўняныя шкарпэткі.
✓Ногі мерзнуць нават у двух валёнках.
✓Медыкі не рэкамендуюць выходзіць з дому без чакушкі.
✓Школьнікі не ідуць у школу, закрытую з-за марозу, а адразу ідуць гуляць на вуліцу.
✓Звяры прыходзяць у егерскія гаспадаркі і здаюцца, афармляючы яўку з пакаяннем.
✓Галубы на падаконніку б'юць чачотку і дыхаюць марознай парай на згорнутыя ў кулак крылы.
✓Дарослыя дзядзечкі возяць за сабой машынкі на вяровачках.

☺ **Вось так, зробіш чалавеку камплімент з нагоды прыгожых вусоў — і ўсё, больш яна з табой не размаўляе!**

☺ — Пакляніся мне, што я ў цябе першая!
— Клянуся, дарагая! Але мне цікава: чаму ўсе жанчыны патрабуюць адно і тое ж?

☺ **Падчас оперы на сцэну перад жаночым хорам выбегла мыш. Аглухлі дзве тысячы аматараў оперы.**




caricatura.ru

## ПЕРШАКУРСНІК НЕ АДКЛЮЧЫЎ АД СЕТКІ ЗАРАДНАЕ...

**У інтэрнаце №3 Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта па сталічнай вуліцы Ванеева адбыўся пажар. У жылым пакоі на трэцім паверсе дзевяціпавярховага будынка загарэліся пасцельныя рэчы.**

Спрацавала сігналізацыя сістэмы перадачы паведамлення «Маланка». Яшчэ да прыбыцця падраздзяленняў МНС загаранне ліквідаваў вахцёр інтэрната, які скарыстаўся ствалом ад пажарнага крана. Пацярпелых не было, эвакуацыя не праводзілася. Здарэнне адбылося ў пакоі першакурсніка, які ў гэты час адсутнічаў у жылым памяшканні. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала кароткае замыканне электраправодкі зараднага прыстасавання тэлефона. У выніку агнём быў пашкоджаны ложак студэнта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЦЯЛЯТЫ НЕ ПАЦЯРПЕЛІ

У Камянецкі райаддзел па надзвычайных сітуацыях патэлефанаваў дыспетчар сельгаспрадпрыемства «Новы шлях» з паведамленнем, што гарыць цялятнік у вёсцы Хамуціны. Да прыбыцця пажарных разлікаў работнікі гаспадаркі паспелі вывесці з памяшкання ўсё пагалоўе — 180 цялят. Пажар быў ліквідаваны за 18 мінут. Агнём пашкоджаны дах і перакрыцце.

**Яна СВЕТАВА.**

Жывая зямля

# СЦЕРАЖЫСЯ, ЗАЙКА! УЦЯКАЙ, ЛІСА!

*Зімовая раніца. Паляўнічы ўзнімае ўгору дубальтоўку, дзьме ў рулю, нібы ў рог і... як па камандзе ганчакі імчаць па полі ў бок зацярушанага снегам лесу. Не мінае і пяці хвілін, а з ускрайку хвойніку ўжо чуецца звонкі сабачы брэх. Па тэмбры галасоў гаспадар адчувае радасны настрой сваіх хуткаsuccessногіх памочнікаў. «Працуюць! Магчыма, паднялі касавокага альбо пагналі рыжую. Ды ці мала звяроў у лесе і ў гэткую сцюжу? Лес жывы! Толькі пусці лайку ці ганчака, адразу ж нешта ўчуюць, некага пагоняць», — разважае паляўнічы і не без цікавасці ўзіраецца ў зіхатлівае снегавое покрыва — раптам сабакі нагоняць лісу ці зайца. Прадчуванне ўдачы дадае азарту, такога неабходнага на паляванні.*







Паляўнічы імкнецца перахітрыць прыроду. Разблытвае звярыныя сляды, маскіруецца, крадзецца, хаваецца, цярпліва чакае моманту сустрэчы з жывёламі. Бярэ на падмогу разумных і спрытных чатырохногіх памочнікаў. Але ўдача — птушка рэдкая. Бо і заяц, і ліса, і куніца ды іншыя лясныя насельнікі не тое што не спяць— яны заўсёды ў «рэжыме чакання» небяспекі. Чакаць дабра ад чалавека ім не выпадае. Але і цярпенню можна здзіўляцца — да апошняга моманту могуць не выдаць сябе. Часам выскокваюць з-пад самых ног паляўнічага. І тады ўжо спадзяюцца толькі на свае ўласныя. І, дзякуй Богу, гэтым часта выратоўваюцца.

Паляўнічы, так і не стрэліўшы за ўвесь дзень, зноў паднімае ўгору зброю і кліча сваіх памочнікаў дахаты.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара і Валерыя КАВАЛЁНКА.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 530. Нумар падпісаны ў 19.30 2 лютага 2012 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12